Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 СНЕЖНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 241 (27851) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Ссек елку — заплаці штраф

СТАР. 3

Дзе ў Мінску з'явяцца новыя паркоўкі

СТАР. 4

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Дзядулева радасць

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы:

«Безадказнасць у любой сферы, а тым больш у інфармацыйным полі, недапушчальная. Добрапрыстойнасць, сумленнасць, адкрытасць характарызуюць прафесійных журналістаў. Папулізм і спекуляцыі ў СМІ нясуць пагрозу стабільнасці ў грамадстве і могуць прывесці да самых сумных наступстваў. Карыстальнікі інтэрнэту (які становіцца галоўнай крыніцай інфармацыі) маюць права на якасны інфармацыйны прадукт і павінны ведаць, каму прад'яўляць прэтэнзіі, калі гэта не так».

■ І сабе, і людзям

ЧЫСТАЯ КАРЫСЦЬ

Як камбінаты бытавога абслугоўвання не толькі выжываюць, але і даюць прыбытак

Побыт, як добра вядома людзям, — вельмі важны фактар у грамадстве. Пачынаючы з сям'і і заканчваючы дзяржавай. У многім падтрымліваць парадак (у самым чыстым сэнсе гэтага слова) дапамагаюць арганізацыі, якія аказваюць бытавыя паслугі. Хоць раз у жыцці, думаю, усе карысталіся паслугамі хімчысткі ці пральні. Тым больш усім вядомыя паслугі па рамонце абутку. Пералічваць можна доўга. І добра, што ёсць пра што казаць, бо калі б не было камбінатаў бытавога абслугоўвання, то добрая частка насельніцтва нашай краіны не ведала б пра ўсе тыя паслугі. Таму давайце завітаем у раёны Мінскай вобласці, дзе праца КБА найбольш эфектыўная.

КАМЕРНАЯ ПРЫБОРКА

«Высокапрадукцыйнае абсталяванне», «шырокі спектр паслуг». Гэта ўвесь час паўтарала **дырэктар Салігорскага раённага камбіната бытавога абслугоўвання Марыя ЖЫЛІЧ,** пакуль вадзіла па сваіх «уладаннях». І сапраўды, пералік паслуг уражвае: і хімчыстка, і аквачыстка, і афарбоўка кажухоў, і чыстка пуховых вырабаў... Штомесяц аказваецца паслуг на 100 млн рублёў.

СТАР. 4

■ Надвор'е

Ізноў ападкі і каля нуля

А ў снежні сіноптыкі сур'ёзных маразоў увогуле не «бачаць»

Напрыканцы тыдня на тэрыторыі краіны захаваецца няўстойлівае і ветранае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

Гэтая пятніца стане самым цёплым днём тыдня, на працягу якога сярэднясутачная тэмпература была ажно на 5-9 градусаў вышэй за кліматычную норму другой дэкады снежня. Удзень часам будзе ісці дождж, а максімальная тэмпература паветра складзе плюс 4-10 градусаў, **па паўднёвым захадзе — да 12 цяпла.** Чакаюцца кароткачасовыя ападкі і ў суботу, калі дождж уначы пачне пераходзіць удзень у мокры снег. Днём — месцамі моцны вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе 1-8 цяпла. У нядзелю чарговая хваля няўстойлівага надвор'я завітае да нас з боку Скандынавіі. Таму крыху пахаладае. У асобных раёнах вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Няўстойлівае надвор'е будзе гаспадарыць у нас і ў пачатку наступнага тыдня. У панядзелак да нас прыйдзе чарговы халодны цыклон. Уначы чакаецца снег, а ўдзень будзе снег разам з дажджом. Тэмпература ўдзень чакаецца ад 0 да плюс 5 градусаў, у Брэсцкай вобласці — да 7 цяпла. Спецыялісты прагназуюць, што падобнае няўстойлівае і вільготнае надвор'е захаваецца ў нас мінімум да серады.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, сур'ёзных маразоў у снежні іх карты ўвогуле не «бачаць».

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

КУРС — НА СТАБІЛЬНАСЦЬ

У тым ліку на валютным рынку

Аб тым, што краіна і надалей будзе прытрымлівацца такой палітыкі, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па эканамічных пытаннях, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Падчас нарады ўвага была засяроджана на пяці асноўных кірунках. У прыватнасці, размова ішла аб сітуацыі на прадпрыемствах рэальнага сектара эканомікі, спыненні неабгрунтаванага росту цэн на тавары і паслугі на ўнутраным рынку. «За межы краіны чым даражэй прадасце, тым лепш, — сказаў Прэзідэнт. — Унутры краіны цэны і так вельмі высокія. Наша насельніцтва ўжо не вывозіць тавары (а гэта барометр), а ездзіць, у прыватнасці, у Расію і Украіну, закупляе там тавары і ўвозіць у Беларусь, у тым ліку беларускія. Канкрэтныя абавязацельствы ў гэтых сферах браў на сябе ўрад. Хацеў бы пачуць, як вырашаюцца гэтыя пытанні».

На нарадзе абмеркавана і тэма зняцця часовых абмежаванняў на ўвоз у Расію беларускіх прадуктаў харчавання і транзіт.

Сярод разгледжаных пытанняў — выкананне асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі. Гэта сфера адказнасці Нацыянальнага банка. «Пры гэтым я хачу закрануць такую далікатную тэму, на якую сёння мала ўвагі звяртаем, у тым ліку кіраўнікі дзяржавы, — гэта абменны курс, сітуацыя на валютным рынку, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Нікога тут не хачу здзівіць, наша пазіцыя застаецца ранейшай. Мы не збіраемся бегчы за Расіяй. Гэта катэгарычна забараняецца, таму што расійскі рынак — незразумела што там, хто што хоча і што там будзе».

«Ваганні на расійскім валютным рынку не паддаюцца ніякаму асэнсаванню», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што дэвальваваць валюту ў Беларусі непрымальна. «У нас ёсць абавязацельствы перад насельніцтвам. І мы іх павінны прытрымлівацца, што, як мне дакладваюць урад і Нацыянальны банк, і робіцца», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што стабільнасць на валютным рынку — гэта абавязак банкаўскай сістэмы на чале з Нацыянальным банкам і ўрада Беларусі; усё астатняе — у руках насельніцтва. «Хочаце абвалу — бегайце па абменніках. Гэта ўсё ў руках грамадзян нашай краіны. Таму ківаць на кіраўніцтва, на ўрад, на Нацыянальны банк сёння непрымальна», — лічыць Прэзідэнт.

Ён запэўніў: «Мы будзем прытрымлівацца стабільнай сітуацыі ў краіне і будзем выкарыстоўваць для гэтага ўсе рычагі, не парушаючы пры гэтым ніякіх фінансава-эканамічных законаў, якія дзейнічаюць аб'ектыўна».

На нарадзе абмяркоўвалася таксама тэма нарошчвання экспарту беларускіх тавараў і яго геаграфічнай дыверсіфікацыі. Паводле слоў Прэзідэнта, у краіне няма праблем з работай прадпрыемстваў. «Яны могуць выпускаць нядрэнную прадукцыю па прымальных цэнах. Пытанне ў продажы гэтай прадукцыі за межы краіны, — лічыць Прэзідэнт. — Прададзім больш — больш валюты будзе. Тады і ўсякія размовы пра валютны крызіс у Расіі, абвал будуць проста пустымі. Усё залежыць ад нас». «Экспарт — пытанне нумар адзін», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада Беларусі весці разлікі з Расіяй у доларах або еўра. «Таму што мы плацім Расіі за энергарэсурсы не ў рублях, а ў доларах. Гэта, дарэчы, недахоп у рабоце ўрада. Трэба было працаваць і патрабаваць ад іх, каб яны нам таксама плацілі ў цвёрдай валюце — у доларах і еўра. Мне дакладвае ўрад, што лёд крануўся. Многія пакупнікі нашай прадукцыі ў Расіі сёння плацяць у доларах. Калі ў рублях — то ў адпаведнасці з курсам на сённяшні дзень, — падкрэсліў Прэзідэнт.

Закранаючы тэму эфектыўнасці продажаў у Расію харчовых тавараў, у тым ліку за кошт скарачэння затрат і ўстаранення пасрэдніцкіх схем, Прэзідэнт адзначыў: «Апошнім часам я ўсё часцей чую: «Ах, расійскі рубель абваліўся, а там 40 працэнтаў нашага экспарту, мы нясём страты». Але што зробіш, такі ў нас сёння партнёр і такая сітуацыя ў Расіі і Украіне — гэта таксама наш партнёр. Але бязвыхадных сітуацый няма. Калі дзе-небудзь нешта страчваем, то трэба знаходзіць у іншым месцы».Напрыклад, у скарачэнні сабекошту. «Пакуль жывём на шырокую нагу, жыруем і думаем, што так будзе і далей. Не, трэба напружвацца і скарачаць затраты».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па ўсіх гэтых пытаннях патрэбны дакладныя і зразумелыя тлумачэнні. «Скардзіцца на сітуацыю няма сэнсу. Мы дамовіліся: у любой сітуацыі павінны жыць і працаваць, іншага не дадзена», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Гарманізацыя заканадаўства

У Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу прайшло чарговае пасяджэнне. Адным з яго найважнейшых вынікаў стала адабрэнне законапраекта «Аб ратыфікацыі пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб супрацоўніцтве ў галіне забеспячэння міжнароднай інфармацыйнай бяспекі», а таксама прыняцце ўнясення дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» (за дзень да гэтага, як паведамляла «Звязда», законапраект у двух чытаннях быў прыняты Палатай прадстаўнікоў). «Гэта неабходна для таго, каб інтэрнэт-рэсурсы, якія з'яўляюцца паўнапраўнымі ўдзельнікамі інфармацыйнага поля, а ў Беларусі больш за 5 мільёнаў карыстальнікаў інтэрнэту, неслі адказнасць за кантэнт», — патлумачыла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

Акрамя таго, уладальнікі рэсурсаў будуць абавязаны выдаляць супрацьпраўны кантэнт пасля вынясення ім адпаведных папярэджанняў з боку Міністэрства інфармацыі. У Міністэрства інфармацыі з'яўляецца права абмяжоўваць доступ да інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў, якія нясуць у сабе пагрозу нацыянальнай бяспецы. Законапраектам упершыню ўводзіцца абавязковае распаўсюджванне агульнадаступнага пакета інфармацыі. На заканадаўчым узроўні аператары электрасувязі павінны будуць трансліраваць пэўныя тэлепраграмы.

19 снежня адбудзецца заключнае пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, дзе разгледзяць законапраекты бюджэту на 2015 год, дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны і ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«На месцах не заўсёды стрымліваюць слова»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў назваў гэта асноўнай праблемай, вызначанай падчас маніторынгу работы дзяржаўных органаў з насельніцтвам

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы Уладзімір Андрэйчанка ўпаўнаважаны курыраваць стан зваротнай сувязі паміж уладай і насельніцтвам у Мінскай вобласці. Учора спікер ніжняй палаты беларускага парламента з гэтай мэтай наведаў Уздзенскі раён, дзе правёў асабісты прыём грамадзян, абмеркаваў праблемныя пытанні з кіраўніцтвам раёна, наведаў цэнтральную раённую бальніцу і адказаў на пытанні журналістаў.

Фота БЕЛТА.

— Правядзенне маніторынгу — вельмі важная работа, і трэба сказаць, што мы не проста арганізуем асабістыя прыёмы грамадзян, «прамыя лініі», але рыхтуемся да гэтага. Напрыклад, у Уздзенскім раёне на працягу доўгага часу працаваў сакратарыят Палаты прадстаўнікоў: мы вывучалі работу не толькі райвыканкама з насельніцтвам, але і службаў аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сельскіх Саветаў, — паведаміў журналістам Уладзімір Андрэйчанка. — Зболышага работа ў гэтым раёне знаходзіцца на патрэбным узроўні, але ёсць і недахопы. Асноўная праблема — улады не заўсёды стрымліваюць сваё слова. Не выконваюць дадзеныя абяцанні. Па Уздзенскім раёне за 2011-2013 гг. больш за 50 зваротаў не задаволены. Яны, канешне, знаходзяцца на кантролі, тэрміны вырашэння азначаных у іх праблем пераносяцца, але гэта няправільна. Людзі ў такіх выпадках губляюць веру ва ўладу.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў заважыў, што размова ідзе пра абгрунтаваныя, зарэгістраваныя звароты. Калі вырашыць праблему немагчыма па аб'ектыўных прычынах (напрыклад, з-за адсутнасці сродкаў), тады трэба размаўляць з людзьмі, тлумачыць ім гэтыя прычыны. «Трэба працаваць на апярэджанне. Але, у прынцыпе, калі слова даў, тады яго стрымлівай, — сказаў спікер. — Трэба больш адказна ставіцца і раённым службам, і выканкаму больш з іх патрабаваць. Ды і дэпутацкаму корпусу трэба глыбей унікаць і займацца гэтымі пытаннямі».

На прыём да кіраўніка ніжняй палаты парламента ў чацвер, 18 снежня, запісаліся сем чалавек. Сярод тых, хто звярнуўся ў гэты дзень, былі і тыя, хто хацеў падзякаваць вышэйшаму кіраўніцтву дзяржавы за палітыку ў вырашэнні жыллёвых праблем, і тыя, хто жадаў унесці прапановы ў заканадаўчыя акты, і тыя, хто сутыкнуўся з невырашальнымі, на першы погляд, праблемамі, якія тычацца не толькі асабістых, але і грамадскіх, дзяржаўных інтарэсаў.

Пра неабходнасць тэрміновага выратавання помніка архітэктуры XVI стагоддзя — былога кальвінскага збору ў пасёлку Першамайскі — расказаў краязнаўца Аляксандр Нікітка. «Стан гэтага будынка патрабуе неадкладнага ўмяшання. У Беларусі ўсяго два падобныя гістарычныя будынкі — у нас і ў Смаргоні, — паведаміў ён. — Такіх больш няма ні на тэрыторыі пражывання заходніх славян, ні ў Прыбалтыцы. Збор унесены ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, але ў планы рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ не ўключаны. Сёння яго яшчэ можна выратаваць».

Краязнаўца прасіў старшыню Палаты прадстаўнікоў дапамагчы ўключыць унікальны помнік архітэктуры ў планы рэстаўрацыі Міністэрства культуры на наступныя пяць гадоў.

Уладзімір Андрэйчанка папрасіў падрыхтаваць адпаведны запыт на імя міністра культуры і паабяцаў перагаварыць з ім на гэтую тэму. «Задача нумар адзін — помнік захаваць, каб ён не разбураўся, — пагадзіўся спікер.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама даручыў кіраўніцтву раёна ўзяць пад спецыяльны кантроль пытанні прыватызацыі жылля, нездавальняючага забеспячэння гарачай вадой і ацяпленнем па канкрэтных адрасах. Ён папрасіў з увагай паставіцца да патрэб сям'і, якая страціла сына, і патлумачыць аднаму з жыхароў раёна магчымасць медыцынскага абслугоўвання не толькі па месцы рэгістрацыі, але і па месцы часовага пражывання.

Уладзімір Андрэйчанка таксама пракаментаваў журналістам нядаўна апублікаваны дэкрэт №5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіраўнічых кадраў і работнікаў арганізацый»:

— У нашай краіне праводзіцца вялікая работа па мадэрнізацыі прадпрыемстваў, стварэнні новых вытворчасцяў. Але калі на прадпрыемстве не будзе дысцыпліны, парадку, адказнасці на ўсіх узроўнях, пачынаючы ад радавых работнікаў і заканчваючы кіраўнікамі, то адбудзецца пустая трата грошай. Таму дэкрэт №5 — вельмі патрэбны, своечасовы. Магчыма, у працэсе яго выканання ўзнікнуць пэўныя нюансы, паглядзім праз паўгода—год, і тады можна будзе ўнесці нейкія змены. Тым не менш дэкрэт у першую чаргу накіраваны на развіццё краіны, на паляпшэнне дабрабыту нашых людзей.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Медыяпрастора

КЛЮЧАВОЕ СЛОВА — «АДКАЗНАСЦЬ»

Маштабная імпрэза ў медыясферы праходзіла днямі ў Мінску. III форум маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню» сабраў у сталіцы супрацоўнікаў рэдакцый газет, радыё і тэлебачання, інтэрнэт-рэсурсаў ва ўзросце да 30 гадоў з усёй краіны, а таксама студэнтаў Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Два дні калегі з розных рэгіёнаў абменьваліся вопытам, наладжвалі стасункі і вучыліся ў майстроў айчыннай журналістыкі.

Фота БЕЛТА.

У першы дзень удзельнікі наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сустрэліся са старшынёй Мінгарвыканкама Андрэем Шорцам у гарадской ратушы, дзе мелі магчымасць задаць мэру свае пытанні.

Другі дзень форуму пачаўся з пленарнага пасяджэння. У вітальным слове **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**, адзначаючы вялікую ролю СМІ ў вызначэнні міжнароднага парадку дня, заявіла, што прафесія журналіста — важная дзяржаўная прафесія. І цяпер, калі медыяпрастора пераўтвараецца ў арэну для інфармацыйных войнаў, як ніколі важная грамадзянская пазіцыя журналіста. І неабходна, каб маладыя журналісты зразумелі яе значнасць і гадавалі ў сабе высокі дзяржаўны стрыжань.

«Вельмі важна, што мы разам можам абмяркоўваць актуальныя праблемы развіцця нацыянальнай медыяпрасторы», — адзначыла міністр. Лілія Ананіч дадала, што падчас форуму будзе закрануты ў тым ліку тэма настаўніцтва. Па яе словах, вельмі важна, каб маладыя журналісты адчувалі падтрымку з боку старэйшых калег і маглі пераймаць вопыт ад мэтраў беларускай журналістыкі.

Па словах **першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра РАДЗЬКОВА,** форум маладых журналістаў — магчымасць пачуць адно аднаго.

«У вас цяпер такі час, калі вы павінны насычаць сябе інфармацыяй. Таму мая парада: прыслухоўвайцеся, прыглядайцеся ўважліва. Гэта дапаможа вам і калісьці спатрэбіцца», — звярнуўся Аляксандр Радзькоў да маладых журналістаў.

Таксама першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта параіў маладым глыбока ўнікаць у сутнасць тэм, над якімі яны працуюць. Ён заклікаў прадстаўнікоў СМІ знаходзіць новыя цікавыя ракурсы, захапляльныя «разынкі» пры асвятленні тых ці іншых з'яў і падзей. Асабліва важна ўмець дэманстраваць унікальнасць нашай краіны, фарміраваць яе годнасць, берагчы сваю супольнасць, гісторыю, прыгожую нацыю.

«Інфармацыйная бяспека — за вамі, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў, звяртаючыся да маладых журналістаў. — Вы павінны вельмі выразна падаваць інфармацыю, разумеючы, што вы — дзяржаўныя людзі. У вас можа быць свой пункт гледжання, нязгода з уладамі, але ваша пазіцыя павінна быць канструктыўнай, а не разбуральнай».

Першы сакратар Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Ігар БУЗОЎСКІ адзначыў, што цяперашняй моладзі ў СМІ прадастаўлены выдатныя магчымасці, але важна ўмець і адказваць за іх. Менавіта адказнасць, а таксама прагматычнасць — у добрым сэнсе гэтага слова — ён вылучыў як асноўныя якасці сучасных маладых журналістаў. Таксама Ігар Бузоўскі заклікаў моладзь быць ініцыятыўнай.

У працяг тэмы **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА** зазначыў, што трэба быць самімі сабой, адкінуць сеткавыя нікі і ўзяць на сябе смеласць выказвацца пад сваімі імёнамі і прозвішчамі — гэта выклікае павагу.

Акурат падчас правядзення III форуму маладых журналістаў Палата прадстаўнікоў прыняла праект закона аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон «Аб сродках масавай інфармацыі».

«Усе змены ў законе можна ахарактарызаваць адным словам — адказнасць. — Чаму Атэла задушыў Дэздэмону? Бо ён паверыў непраўдзівай інфармацыі», — прывёў красамоўны мастацкі прыклад старшыня Белтэлерадыёкампаніі.

Пасля выступаў членаў прэзідыума ўдзельнікі форуму мелі магчымасць задаць ім пытанні. Не дзіўна, што большасць з іх датычылася змен у Законе «Аб сродках масавай інфармацыі». Затым прадстаўнікоў СМІ чакаў «Адкрыты дыялог» з удзелам міністра інфармацыі і кіраўнікоў вядучых медыя краіны, майстар-класы ад прафесіяналаў, «круглы стол» на тэму «Пераемнасць у журналістыцы». Адным з самых прыемных момантаў стала ўручэнне пераможцам прэміі для маладых журналістаў «Дэбют». У пяці намінацыях (лепшы рэпарцёр, лепшы аглядальнік, лепшы вядучы тэлепраграм, лепшы вядучы радыёпраграм і лепшы фотакарэспандэнт) узнагароды атрымалі прадстаўнікі выданняў «Чырвоная зорка» (Уздзенскі раён), «Рэспубліка», інфармагенцтва БЕЛТА, Белтэлерадыёкампаніі, радыёстанцыі Радыус-FM. З высокай адзнакай творчых здабыткаў маладых журналістаў павіншаваў старшыня Беларускага саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты «Рэспубліка» Анатоль Лемяшонак.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

■ Віншуем калегу!

Высокая ўзнагарода — за творчасць і адказнасць

Учора прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў дзяржузнагароды заслужаным людзям Беларусі.

«Заўсёды ў працоўных калектывах ёсць людзі, якія крэатыўныя ва ўсіх адносінах, яны імкнуцца зрабіць усё лепш, — адзначыў прэм'ер-міністр. — І калі гэта дае нейкія дадатковыя эканамічныя рашэнні, прыносіць выгаду прадпрыемству, то, безумоўна, заслугоўвае заахвочвання».

Усё вышэйсказанае — і пра нашага калегу, паэта, намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» — галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Алеся Бадака, які ўчора атрымаў з рук прэм'ер-міністра медаль Францыска Скарыны. Алесь Мікалаевіч, вядомы пісьменнік, сапраўды творчы ва ўсім, у тым ліку і на сваёй адказнай пасадзе. За час яго кіравання ўзняўся на новы якасны ўзровень часопіс «Нёман», часопіс «Полымя», які ён узначальвае зараз, таксама мяняецца ў бок сучасных тэндэнцый у літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Пры гэтым Алесь Бадак паспявае пісаць новыя творы, якія знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў.

Шчыра віншуем калегу з узнагародай і зычым яму натхнення, новых вершаў і новых дасягнутых вяршынь!

У бізнесмены я пайшоў бы... Хай мяне навучаць!

Учора на Гомельшчыне ў рамках адзінага дня інфармавання вялі размову аб стварэнні ўмоў для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

На тэрыторыі вобласці зараз зарэгістравана больш за 39 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Аналіз размеркавання малых і сярэдніх прадпрыемстваў па раёнах вобласці паказвае, што вялікая іх частка сканцэнтравана ў горадзе Гомелі, Мазырскім, Жлобінскім, Светлагорскім, Гомельскім і Рэчыцкім раёнах.

Інфармацыйныя групы аблвыканкама пабывалі ў большасці раёнаў вобласці, сустрэліся з людзьмі, якія цікавяцца магчымасцю стварэння ўласнага прадпрыемства. Дарэчы, прыватны бізнес на Гомельшчыне сёння значна ўплывае на развіццё сельскіх тэрыторый вобласці. Чвэрць з зарэгістраваных сёлета прадпрыемстваў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці і ў малых гарадах, дзе дзейнічаюць пэўныя льготы. Пра іх, а таксама пра дзяржаўныя дакументы, якія спрыяюць адкрыццю сваёй справы, ішла гутарка ў працоўных калектывах вобласці. Сёння прыкладна 18,5% сродкаў у бюджэт Гомельшчыны забяспечваюць прадпрымальнікі. З пачатку года па накіраваннях органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне было арганізавана навучанне 300 чалавек па адукацыйнай праграме курса «Асновы прадпрымальніцтва». Такім чынам, стварэнне ўмоў і падтрымка малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Гомельскай вобласці дазваляюць вырашаць не толькі эканамічныя, але і сацыяльныя пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Даходы з адходаў

ЗДАЦЬ СТАРУЮ ТЭХНІКУ... У КРАМУ

Наколькі гандлёвыя прадпрыемствы падрыхтаваны да новаўвядзення?

Нядаўна пачала дзейнічаць пастанова Савета Міністраў №1124, згодна з якой у крамах, што вядуць рознічны гандаль, пачнуць збіраць адходы электроннага і электрычнага абсталявання (далей — ЭЭА) і ўпакоўку (папера і кардон, шкло, пластык) ад насельніцтва. Гэта складаная бытавая тэхніка, электроніка, асвятляльныя прыборы, цацкі, медыцынскае абсталяванне, батарэйкі, лямпачкі, якія змяшчаюць ртуць.

Супрацоўнік па хімічнай бяспецы Цэнтра экалагічных рашэнняў Анатоль КАЛАЧ патлумачыў, чаму адходы ЭЭА становяцца праблемай:

— З кожным годам аб'ёмы вытворчасці названых тавараў павялічваюцца, а тэрмін службы раней прададзеных скарачаецца. Калі некалі халадзільнікі працавалі па 30-40 гадоў, зараз яны ледзь «вытрымліваюць» дзесяцігоддзе. Іх рамонтапрыгоднасць пад сумненнем: па кошце танней набыць новы халадзільнік.

У выніку палігоны з цвёрдымі бытавымі адходамі вельмі хутка запаўняюцца старой тэхнікай. Альбо забруджваюць наваколле, «сумуючы» на дваравых сметніках. А ў электроніцы змяшчаюцца шкодныя рэчывы. Для даведкі: у кінескопе старога тэлевізара знаходзіцца да 2 кілаграмаў свінцу!

Пачынаючы з 1 студзеня, адходы ЭЭА і ўпакоўку будуць прымаць у 3128 крамах (сёння іх налічваецца прыкладна 400).

Галоўны спецыяліст дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Сяргей ЮРЧА больш дэталёва патлумачыў, што зменіцца ў сістэме збору адходаў ЭЭА:

— Абавязак па іх прыёме ад фізічных асоб распаўсюджваецца не на ўсе аб'екты рознічнага гандлю — гэта залежыць ад плошчы крамы і яе спецыялізацыі. Так, упакоўку могуць прымаць крамы гандлёвай плошчай больш за 1000 квадратных метраў. Для кожнага віду прадугледжаны асобны кантэйнер. Батарэйкі можна будзе здаць супрацоўніку крамы альбо пакідаць у кантэйнерах. Правіла працуе для любога тыпу крамы, плошча якой большая за 100 квадратных метраў. Тэхніку забяруць ва ўніверсальных гандлёвых аб'ектах плошчай ад 1000 «квадратаў» альбо ў камбінаваных (ад 500 квадратных метраў). Для буйнагабарытнай прадугледжаны пляцоўкі ў краме ці каля яе. Ртутныя лямпачкі можна будзе аднесці ў крамы з плошчай больш за 400 квадратных метраў. Для «змеек» таксама ёсць патрабаванне — яны павінны быць цэлымі.

У пастанове прапісаны і канкрэтныя параметры кантэйнера: канструкцыя ні ў якім разе не павінна прывесці да разбівання лямпачкі. Супрацоўнікі прадпрыемства па перапрацоўцы і ўтылізацыі адходаў ААТ «БелВТІ» прадэманстравалі падобныя «скрынкі», зробленыя са звычайнага кардону. Яны не надта вялікія, таму закінуць лямпачку не атрымаецца — толькі акуратна пакласці.

Дадатковая ўмова — гэта размяшчэнне ў крамах інфармацыйных стэндаў, дзе будзе пазначана месцазнаходжанне пункта збору адходаў і від адходаў, які тут прымаюць.

Са старой тэхнікі можна «выцягнуць» карысныя другасныя рэсурсы і атрымаць прыбытак: напрыклад, з тоны адходаў выходзіць ад 4 да 8 грамаў каштоўных металаў.

А што далей? Крамы маюць права перадаваць адходы зацікаўленым юрыдычным асобам — нарыхтоўчым установам, якія займаюцца абяссшкоджваннем адходаў. У кожным рэгіёне будуць прызначаны арганізацыі, адказныя за збор. У рэшце рэшт, крамы і гандлёвыя сеткі змогуць атрымаць грашовую кампенсацыю за збор адходаў.

Хаця пастанова пачала дзейнічаць, у «зборшчыкаў» застаюцца пытанні. Пра некаторыя з іх расказаў кіраўнік аддзела прававой і кадравай працы ААТ «Электрасэрвіс і Ка» (гандлёвая сетка «Электрасіла») Дзмітрый КАЖЭЎНІКАЎ:

— Асобныя групы тавараў не трапляюць пад азначэнне буйной, сярэдняй, дробнай бытавой тэхнікі і таму фармальна яны «выпадаюць» са спіса. Гэта ўсім вядомыя варачныя паверхні і духавыя шафы. І што з імі рабіць?

Іншая праблема — права ўласнасці. Незразумелым для буйных гандлёвых сетак застаецца пытанне пра бухгалтарскі ўлік. Атрымліваецца, калі ў крамах збіраюць адходы бясплатна, то, згодна з Падатковым кодэксам, яны павінны плаціць за гэта падатак. Аднак пакуль бухгалтары буйных крам «ламаюць галаву» над дэталямі новай пастановы, наладжаная сістэма ўжо даўно распрацавана спецыялістамі «БелВТІ», якія запрашаюць буйныя гандлёвыя сеткі да супрацоўніцтва. Яны зразумелі, што са старой тэхнікі можна «выцягнуць» карысныя другасныя рэсурсы і атрымаць прыбытак: напрыклад, з тоны адходаў выходзіць ад 4 да 8 грамаў каштоўных металаў. Удала дзейнічае паслуга «БелВТІ-таксі» — груваст-кую тэхніку забіраюць і бясплатна адвозяць на пункт збору. За год ад юрыдычных і фізічных асоб сабрана 650 тон адходаў.

Зараз стаіць і праблема з батарэйкамі. Пакуль у Беларусі няма прадпрыемства па іх перапрацоўцы і абясшкоджванні, мы можам толькі збіраць іх. Дырэктар ААТ «БелВТІ» Аляксандр КІРПІЧНІК адзначыў, што пакуль што весці гаворку пра будаўніцтва прадпрыемства, якое сябе акупляе, рана:

— Атрымаць прыбытак можна пры лічбе 100 тон батарэек у год, а мы назбіралі прыкладна 20 тон за два гады, — падсумаваў спецыяліст.

Прадстаўнікі гандлёвых сетак адзначылі, што яны будуць праводзіць стымулюючыя акцыі кшталту бясплатнай дастаўкі буйнагабарытнай тэхнікі за здадзеныя адходы альбо прадастаўляць кліентам зніжкі на прадукцыю.

Кацярына РАДЗЮК

■

■ Не парушай!

Ссек елку — плаці 45 мільёнаў

Міністэрства лясной гаспадаркі перайшло на ўзмоцнены рэжым аховы лясоў для недапушчэння высечак хваёвых дрэў у сувязі з навагоднімі святамі.

Аператыўныя рэйдавыя мерапрыемствы будуць праводзіцца мінлясгасам сумесна з Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікамі міністэрстваў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і ўнутраных спраў. На дарогах краіны будзе выстаўлена каля 300 кантрольных пастоў.

За незаконнае знішчэнне, выняцце ці пашкоджанне дрэў і кустарнікаў, што растуць у лясах першай групы (якія не эксплуатуюцца ў лясной гаспадарцы), для фізічных асоб прадугледжаны штрафы ў памеры ад 5 да 50 базавых (ад 750 тысяч да 7,5 мільёна рублёў). Індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы могуць быць пакараны штрафам, адпаведна, да 30 і 45 мільёнаў рублёў. За пашкоджанне лесу другой групы фізічныя асобы могуць быць пакараны штрафам да 30 базавых (4,5 мільёна), індывідуальныя прадпрымальнікі — да 150 базавых (22,5 мільёна), юрыдычныя асобы — да 300 базавых (45 мільёнаў).

Падрыхтавацца да свят можна без парушэння закону: з 22 снежня па ўсёй краіне будзе арганізавана каля 1000 гандлёвых пунктаў, дзе можна набыць навагоднія дрэвы па прымальных цэнах — ад 50 тысяч рублёў. Вясковыя жыхары і іншыя ахвотныя могуць набыць елку ў сваім лясніцтве па яшчэ больш нізкіх цэнах.

Па словах **начальніка ўпраўлення лясной гаспадаркі Мінлясгаса Мікалая ЮРЭВІЧА,** попыт на натуральныя навагоднія дрэвы ў апошнія гады значна знізіўся. Калі напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х Беларусь экспартавала ў краіны былога Савецкага Саюза каля 1,5 мільёна дрэў штогод, то цяпер аб'ёмы рэалізацыі елак у Беларусі і за мяжу складаюць каля 200 тысяч адзінак. Каля 2,7 мільёна беларускіх навагодніх дрэў вырошчваюцца цяпер на 800 гектарах спецыяльных плантацый.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

ХУТКА І БЯСПЕЧНА

Пачалася электрыфікацыя чыгуначнай веткі, якая вядзе з Вільнюса (станцыя Науёі — Вільня) да мяжы з Беларуссю. На ўрачыстай цырымоніі пачатку работ прысутнічаў і прэм'ер Літвы Альгірдас Буткявічус.

«Электрыфікацыя чыгуначнай веткі, якая злучае нас з Беларуссю, павысіць прывабнасць чыгуначнага транспарту ў сферах перавозкі грузаў і пасажыраў і знізіць забруджванне атмасферы. Пра гэта мы нядаўна гаварылі з прэм'ерам Беларусі. Пасяховае завяршэнне гэтага праекта будзе спрыяць і ўмацаванню двухбаковых літоўска-беларускіх сувязяў, — заявіў А. Буткявічус. — Нам вельмі важна, каб грузы ў Клайпедскі порт дастаўляліся хутка і бяспечна. У будучыні чыгунка ад мяжы з Беларуссю да Клайпеды павінна стаць асноўным калідорам грузаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, краін Сярэдняй Азіі і Кітая».

Гэты праект мяркуецца завяршыць у сакавіку 2016 года. У цэлым будзе электрыфікавана 28,6 кіламетра чыгуначнага пуці, а таксама рэканструявана цягавая падстанцыя ў Вільнюскім мікрараёне Науёі — Вільня.

Пасля электрыфікацыі гэтай чыгуначнай веткі паміж Вільнюсам і Мінскам дызельныя лакаматывы будуць заменены электрычкамі, якія не забруджваюць атмасферу, больш магутныя, едуць хутчэй. Акрамя таго, электрычкамі возяць грузы і пасажыраў танней. Тады пачнуць курсіраваць камфартабельныя двухпавярховыя пасажырскія цягнікі, якія ўжо 4 гады паспяхова эксплуатуюцца на лініі Вільнюс — Каўнас. Літва ўжо заказала тры новыя двухпавярховыя электрычкі для абслугоўвання маршруту Вільнюс — Мінск. Яны развіваюць хуткасць да 160 км за гадзіну. Час у дарозе скароціцца з 3 да 2 гадзін.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.
Вільнюс.

■ Сталічны час

МЭР ЧАКАЕ АД МІНЧАН ПРАПАНОЎ

Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац сустрэўся з маладымі журналістамі

Падчас мерапрыемства рэпарцёры-пачаткоўцы з усёй краіны мелі магчымасць задаць гораданачальніку пытанні, якія тычыліся не толькі сталіцы, але і Мінскага раёна. Сустрэча ў гарадской ратушы адбылася ў рамках III форуму маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню».

Фота БЕЛТА.

НЯПРАВІЛЬНА ПАРКУЕШСЯ — АТРЫМАЕШ «ЛІСТ ШЧАСЦЯ»

Гутарка атрымалася жывой і, што важна, двухбаковай. Андрэй Шорац, які на працягу гадзіны адказваў на пытанні, адразу падкрэсліў: «Мінгарвыканкам адкрыты для супрацоўніцтва», а таксама назваў маладых журналістаў «калегамі».

— Важнасць вашай працы і вашага прафесіяналізму вызначае, якое меркаванне складзецца ў грамадзян аб розных падзеях. Таму ваша задача — праўдзіва асвятляць тыя ці іншыя з'явы, каб у насельніцтва складалася аб'ектыўная карціна таго, што адбываецца навокал, — сказаў старшыня Мінгарвыканкама.

Падчас сустрэчы Андрэй Шорац пералічыў асноўныя праблемы, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

— У Мінску хапае праблемных пытанняў. Напрыклад, у сферах аховы здароўя, адукацыі. Існуе праблема з якасцю пітной вады. Вострa адчуваецца недахоп дзіцячых садкоў. Напрыклад, у Каменнай Горцы іх напаўняльнасць складае 152 працэнты. Ёсць праблема з паркоўкамі, горад перагружаны аўтатранспартам. Але Мінгарвыканкам адкрыты для прапаноў аб тым, як зрабіць наш горад лепшым.

Вядома, за адну гадзіну немагчыма не тое што агучыць план па рашэнні складаных пытанняў, а нават і пералічыць іх усе. Тым не менш некаторыя з іх старшыня Мінгарвыканкама акрэсліў падрабязней за іншыя. Напрыклад, праблему недахопу парковачных месцаў у сталіцы плануецца вырашаць пры дапамозе будаўніцтва паркінгаў — як дзяржаўных, так і прыватных.

— Але, з іншага боку, цяпер нават тыя паркінгі, якія ёсць у горадзе, не загружаны. Нярэдка можна бачыць пусты паркінг, а каля яго машыны ўздоўж дарог і на прыдамавых тэрыторыях стаяць ледзь не адна на адной, — заўважыў Андрэй Шорац.

Іншы падыход да праблемы, які плануецца ажыццяўляць, — пашырэнне зон платнай паркоўкі. Па меркаванні мэра, на працягу наступнага года з'явіцца 10 тысяч месцаў на трох вызначаных у горадзе закальцаваных вуліцах.

— У прынцыпе, схема ўжо адпрацаваная. Мы бачым гэта ў Верхнім горадзе: сістэма працуе без непасрэднага чалавечага ўдзелу, у раёне ЦУМа частку вуліц ужо пераводзяць у разрад платных, Інтэрнацыянальную закрылі.

Гэтая сістэма будзе пашырацца, паабяцаў гораданачальнік. Апроч таго, гарадскімі ўладамі закуплены спецыяльныя прыборы, якія кантралююць зону няправільнай паркоўкі. Паводле іх даных, аўтаўладальнікам, якія парушаць правілы паркоўкі, будуць дасылаць ужо многім вядомыя «лісты шчасця». Толькі зафіксавана на іх будзе не хуткасць, а спосаб стаянкі аўтамабіля. Таксама плануецца павелічэнне кошту паркоўкі ў цэнтры горада і яго зніжэнне на ўскраінах.

ПАБУДУЮЦЬ «МІНСК-МІР» І ЗОЙМУЦЦА АСМАЛОЎКАЙ

Адной з самых актуальных тэм падчас сустрэчы стала горадабудаўніцтва. Андрэй Шорац паведаміў, што чарга на арэнднае жыллё ў сталіцы складае 230 чалавек; пры гэтым аб'ёмы будаўніцтва ў горадзе будуць скарачацца. Разам з тым, старшыня Мінгарвыканкама паведаміў, што ў рамках рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Эксперыментальны шматфункцыянальны комплекс «Мінск-Мір» на тэрыторыі былога аэрапорта «Мінск-1» пабудуюць каля 1,8 млн кв.м жылля, прыкладна 600 — 800 тысяч кв.м будынкаў грамадскага, культурнага і сацыяльнага прызначэння. Арабскі інвестар прыняў на сябе абавязацельствы ўзвесці за ўласныя сродкі школу і дзіцячы садок. Ядром гэтага комплексу будзе міжнародны фінансавы цэнтр, які, як мяркуецца, дазволіць нашай краіне выйсці ў лідары на прасторы СНД у аказанні фінансавых паслуг. Значную долю фінансавай нагрузкі па будаўніцтве інфраструктуры і аб'ектаў сацыяльнага прызначэння прыняў на сябе гарадскі бюджэт.

Аднак не толькі ўзвядзенне новых будынкаў хвалюе моладзь, але і захаванне старых. Так, падчас сустрэчы прагучала пытанне аб захаванні сталічнага квартала Асмалоўка — першага пабудаванага ў пасляваенным Мінску. Ён знаходзіцца ў межах вуліц Багдановіча, Кісялёва, Куйбышава і Камуністычнай і захоўвае чароўную атмасферу горада канца 1940-х гадоў. Не так даўно грамадская супольнасць была ўсхвалявана весткай, што Асмалоўка пойдзе пад знос. Аднак Андрэй Шорац гэтыя чуткі не пацвердзіў — зрэшты, як і не абвергнуў.

— Ёсць шмат меркаванняў наконт далейшага лёсу квартала. Гэтае пытанне дастаткова складанае, і вырашаць яго неабходна комплексна. Трэба правесці разлікі, грамадскае абмеркаванне, дэталёва вывучыць сітуацыю і толькі тады прымаць нейкія рашэнні. Адно вядома дакладна: у такім стане руйнавання гэтая тэрыторыя, улічваючы яе вялікую горадабудаўнічую каштоўнасць, знаходзіцца не можа. Вядома, падобнае пытанне не вырашыць сёння ці заўтра. Але ў бліжэйшыя чатыры-пяць гадоў мы павінны гэта зрабіць, — заявіў мэр.

Андрэй Шорац гутарыў з маладымі журналістамі яшчэ на многія тэмы. А напрыканцы размовы нагадаў, што адкрыты для прапаноў. Калі ёсць нейкі праект, гарадскія ўлады дапамогуць яго рэалізаваць, і тады гэта будзе карысна і людзям, і гораду.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Тры пытанні да ўлады

НЕ ДАРЭМНА ЎКЛАДАЛІ Ў «МАЛОЧКУ»

Трэцюю частку Кармянскага раёна займаюць лясы. Астатняя тэрыторыя — ворныя землі з балам глебы каля 36. Іх каля 40 тысяч гектараў, таму невыпадкова, што развіваюць тут актыўна менавіта сельскую гаспадарку. Сёлета валавы намалот зерня склаў на 62% больш, чым летась. За два папярэднія гады, між іншым, на Кармяншчыне было ўведзена шэсць сучасных малочных даільных комплексаў, — расказвае старшыня райвыканкама Аляксей ЯСОНАЎ:

— Вынікі гэтага ўвядзення вы ўжо адчулі?

— Безумоўна. Прыкметна павялічылася прадукцыйнасць працы і вытворчасць жывёлагадоўчай прадукцыі. Камп'ютары на новых комплексах поўнасцю адсочваюць фізіялагічны стан і прадукцыйнасць жывёл. Цяпер надоі складаюць больш за 4750 кг малака на карову. А, напрыклад, на новай ферме «Высокае» КСУП «Саўгас «Кармянскі» — у межах 5400 кг. Канешне, з увядзеннем новых фермаў значна палепшылася тэхналогія даення і ўмовы працы для супрацоўнікаў. Аптымізавана колькасць працуючых, што ў выніку прывяло да значнага павышэння іх заробкаў. Напрыклад, на вышэйназванай ферме даярка зараз атрымлівае Br12 млн. Зразумела, калі раней існавала праблема з кадрамі, то цяпер яе няма.

— Традыцыйна аграрны раён мае, аднак, і сваё градаўтваральнае прадпрыемства, рэканструкцыя якога павінна завершыцца сёлета.

— Так, падыходзіць да завяршэння рэканструкцыя філіяла «Кармянскі льнозавод» ААТ «Гомельлён». У гэтую вытворчасць укладзены вялікія сродкі, там імпартнае абсталяванне, і ўжо сёння ёсць станоўчыя вынікі. Калі старая лінія дазваляла з адной тоны сыравіны атрымліваць 20-25% доўгага валакна, сёння мы яго атрымліваем каля 40-45%. Канешне, гэтыя ўдасканальванні ўрэшце адаб'юцца і на павелічэнні падаткаў у мясцовы бюджэт. Вырасце і заробак людзей, якія працуюць на прадпрыемстве. Там жа паставілі лінію брыкетавання адходаў ільновытворчасці, якія выкарыстоўваюцца ў якасці паліва. У планах — усталяваць газатурбінную ўстаноўку, каб вырабляць электраэнергію на самім прадпрыемстве і яе выкарыстоўваць. Дарэчы, налета мы плануем увесці ў строй філіял ААТ «Рэчыцкі тэкстыль». Гэта будзе прынцыпова новая вытворчасць тканін для дома.

— Аляксей Аляксандравіч, усе вытворчыя вынікі павінны адчуць жыхары на сваім дабрабыце. Ці не так?

— Наш невялікі гарадок Карма сёння мае інфраструктуру, якая пастаянна ўдасканальваецца. У першым паўгоддзі быў здадзены дом, у якім 20 з 30 кватэр — для маладых спецыялістаў. У другім паўгоддзі мы ўвялі 12-кватэрны дом. У ім 8 кватэр прадастаўлены шматдзетным сем'ям. Шмат увагі надаецца пытанням навядзення парадку на зямлі. Жыхары імкнуцца зрабіць кожны населены пункт раёна яшчэ больш прыгожым. Райцэнтр пастаянна абнаўляецца. Сёння мяняецца і стаўленне людзей да зямлі, сваёй працы, усяго навакольля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.

ЧЫСТАЯ КАРЫСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Заходзім у цэх, дзе ачышчаюць пухавыя вырабы. Вялікая машына яшчэ савецкіх часоў аглушальна, але спраўна працуе. «Яна такая адна ў Мінскай вобласці засталася, — гаворыць кіраўнік КБА. — Мы яе вельмі цэнім, нягледзячы на тое, што ёй шмат гадоў. Тут чатыры камеры ачысткі. У кожнай застаюцца камяні, пясок, пыл, а ў чацвёртай — ужо чыстае пяро ці пух». Насамрэч рарытэтная машына. І, як сцвярджаюць спецыялісты, нашмат лепшая за новую, бо там толькі адна камера. Таму новая стаіць у куточку без работы.

А вось у хімчыстцы — вельмі якаснае нямецкае абсталяванне. Прымяняецца больш за 60 розных прэпаратаў. Абсталяванне складанае, з мікрапрацэсарамі, але спецыялісты прафесійна ім карыстаюцца. Усяго 8 чалавек, з якіх трое маюць стаж 34 гады. Таму і якасць працы самая высокая. Летась праводзіўся першы рэспубліканскі конкурс сярод работнікаў хімчыстак. І ў дзвюх намінацыях мы занялі першыя месцы. У нас, напрыклад, працуе лепшая плямавыводчыца ў краіне — Алена Ананенка».

Пераможца конкурсу пагадзілася паказаць сваю працу. Яе задача — падрыхтаваць выраб для чысткі ў машыне. Падыходзім да плямавыводнага станка, дзе Алена Ананенка хуткімі і адточанымі рухамі выдаляе з пінжака пляму з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў. Увесь працэс заняў некалькі секундаў. «Але з больш складанымі выпадкамі трэба нашмат больш часу», — гаворыць прафесіяналка.

Ёсць на прадпрыемстве і іншыя рэдкія спецыялісты. Напрыклад, тыя, што чысцяць і фарбуюць кажухі. Кажуць, што для іх падрыхтоўкі трэба шмат часу і высілкаў. Пры гэтым людзі з усяго раёна маюць магчымасць праз комплексныя прыёмныя пункты атрымаць увесь пералік паслуг КБА. Сетку КПП для гэтага спецыяльна пашырылі.

СУМНАЯ, АЛЕ ВЫГАДА

Не ведаю, ці здасца вам гэта дзіўным, але самыя запатрабаваныя паслугі ў КБА — рытуальныя. «Гэты від паслуг набірае абароты. Зала для пахавальных цырымоній працуе другі год. Выручка з пачатку года — каля 70 мільёнаў, — распавядае Марыя Жыліч. — Тут нават проста на ноч пакідаюць нябожчыка, асабліва калі прыязджаюць на пахаванне пажылыя людзі ці з іншых гарадоў. Паслугамі залы карысталіся нават вельмі «вялікія» людзі нашага горада. І гэта будучыня, бо ў кватэрах мала месца для такіх цырымоній. Як тое ні сумна, але гэта такая ж бытавая паслуга, як і астатнія, што мы прапануем». А рытуальная прадукцыя нават да склада рэдка даходзіць — адразу прадаецца ўсё. Вось яно як.

Аднак і пральня не стаіць без работы. Праўда, у асноўным займаецца аказаннем паслуг арганізацыям. Бальніцы, воінскія часці, санаторый, дзіцячыя садкі і гэтак далей. Таксама мыюць пледы і дываны. У насельніцтва асаблівай папулярнасцю карыстаецца менавіта гэтая паслуга. «Але нас не задавальняе якасць чысткі, — гаворыць дырэктар. — Мы хочам купіць новае абсталяванне для мыцця дывановых вырабаў. Мы нават яго ўжо знайшлі на адным айчынным прадпрыемстве. Цяпер шукаем грошы. Ёсць у КБА і канкурэнты — індывідуальныя прадпрымальнікі. Прапануюць трошкі меншыя цэны, бо ў іх падатковая нагрузка меншая, яны не плацяць ПДВ».

Цуда-машына, якая ачышчае пер'е і пух.

Швейны цэх таксама завалены заказамі. У асноўным людзі хочуць пашыць наматрацнікі. Патлумачу, чаму: матрацы сёння вельмі якасныя і дарагія, напрыклад, артапедычныя, і для таго, каб іх абараніць ад забруджвання, людзі карыстаюцца наматрацнікамі. Акрамя гэтага, цэх нядрэнна зарабляе на вырабе сувенірнай прадукцыі (шматлікія льняныя сурвэткі ды абрусы). Напрыклад, за восень на розных кірмашах рэалізавалі прадукцыі на 400 мільёнаў рублёў.

«СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ»

У Слуцку ў Доме быту таксама аказваюцца ўсе віды паслуг. Ад пашыву адзення да прычосак і стрыжак. Ажыццяўляецца гэта ўсё праз дзяржаўныя фабрыку пашыву адзення і прадпрыемства «Сяльчанка». Толькі 10% плошчаў аддадзена для прыватных паслуг.

Як і ў Салігорску, у бытавых службах працуюць вельмі кваліфікаваныя спецыялісты. Пра гэта можа красамоўна сведчыць той факт, што фабрыка шыла аднойчы на заказ французскага брэнда. «Наша перавага ў тым, што мы захавалі вялікую колькасць закройшчыц — ажно 12», — сцвярджае **Валянціна КУДЗЕЛЬКА, дырэктар Слуцкай фабрыкі пашыву адзення.** Між іншым, у гэтыя дні ў прадпрыемства ёсць вельмі адказны заказ — пашыў сукенак і формы для кадэцкага балю з удзелам Прэзідэнта Беларусі.

У сваю чаргу «Сяльчанка» прапануе больш шырокія паслугі — цырульныя, пральныя, рытуальныя, хімчыстку, пракат і іншае. Прадпрыемства мае 19 КПП у сельскай мясцовасці. «І яны могуць быць прыбытковымі, калі там будзе гандаль з абаротам мінімум 10 мільёнаў за месяц, — гаворыць **Аляксандр ВАЛАТОВІЧ, дырэктар КУП «Сяльчанка»,** і дадае некалькі слоў аб іншай праблеме: Ёсць цяжкасці з майстрамі па рамонце бытавой тэхнікі і абутку. Яны пайшлі на «вольныя хлябы». А новых няма. Іх ніхто не рыхтуе».

***

Чаму падобныя прадпрыемствы ў розных рэгіёнах адчуваюць сябе вельмі кепска і знаходзяцца на грані закрыцця? Рэцэпт выжывання ёсць у Марыі Жыліч: «У нас ёсць база ў горадзе. І мы не прадаём свае плошчы — лепей у арэнду здадзім. Стабільнасць кадраў вельмі дапамагае». КБА прыносяць насельніцтву карысць у чыстым выглядзе, таму ёсць нагода задумацца над падтрыманнем гэтых прадпрыемстваў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.

Салігорскі раён, Слуцкі раён.

НА КАЛЯДЫ БЕЗ КАЗЫ, А НА ВЯСЕЛЛЕ З «ЗАЙЦАМІ»

РАДАСНА, ШТО ЖЫВУЦЬ НА ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ ЛЮДЗІ — ТАЛЕНАВІТЫЯ, ПРАЦАВІТЫЯ, АПАНТАНЫЯ СПРАВАЙ

Зіма, як і любая пара года, кожным з нас успрымаецца па-рознаму. Аднак без сумнення можна сказаць, што навагоднія святы — прычына для радасці і магчымасць адпачыць у коле родных, сяброў за кубачкам духмянай кавы, можна і з песнямі. Так, у вёсцы Барань Аршанскага раёна нас са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» сваёй творчасцю сагравалі адразу два калектывы — узорны фальклорны калектыў «Шчодрыкі» і народны ансамбль народнай музыкі і песні «Крынічанька».

Як той казаў, маладым усюды дарога, таму і на сцэну першымі выйшлі юныя артысты. Хлопцы і дзяўчаты ўзброіліся не толькі галасамі, але і інструментамі. Вызначыўшыся з расстаноўкай артыстаў на сцэне, каб і салісты, і музыканты не засланялі адзін аднаго, слухаем першую песню, калядную…

Ой, калядныя бліны ладныя,
Люлі-люлі, бліны ладныя.
Вы, калядачкі, прыбліжыцеся,
Ой, люлі-люлі, прыбліжыцеся.
Нам Піліпаўка надакучыла,
Ой, люлі-люлі, надакучыла.
Жываты нашы пазамучвала,
Ой, люлі-люлі, пазамучвала
Ой, калядныя бліны ладныя.

— Калектыў «Шчодрыкі» арганізавалі ў 1992 годзе. Гэта ўжо не першы склад удзельнікаў бо дзеці ж падрастаюць і сыходзяць. У 2002 годзе калектыву было прысвоена званне «ўзорны». Я езджу ў фальклорныя экспедыцыі, збіраю песенны матэрыял нашай Аршаншчыны. Калі нешта нам падабаецца, то бяром такія песні ў рэпертуар,— робіць экскурс у гісторыю і расказвае пра надзённае **кіраўнік Вячаслаў ШПАКОЎСКІ.**

Ладна гучаць галасы і трымаюць партыі музычныя інструменты… А пасля вядучая спрабуе высветліць, што слухаюць тут па-за сцэнай. Густы, як і таленты, аказваецца, прадстаўлены ў гэтым калектыве ў багатай палітры: адным падабаецца творчасць «Песняроў», другія «Тяни-толкай» слухаюць, іншыя аддаюць перавагу рэпу, року… Аднак аб'ядноўвае іх любоў да беларускай народнай песні.

Пасля маладзейшых артыстаў свае таленты дэманструюць удзельнікі «Крынічанькі». У рэпертуары калектыву ёсць і калядныя, і карагодныя, і многія іншыя песні… Адна з іх жартаўліва распавядае пра жаночыя клопаты:

Панядзелак панядзельнічала,
А ў аўторак я аўторнічала.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.
У аўторак я аўторнічала,
А ў сярэду сабе баню тапіла.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.
У сярэду сабе баню тапіла,
А ў чацвер я там папарылася.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.
У чацвер там я папарылася,
А ў пятніцу добры людзі не прадуць.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.
А ў пятніцу добры людзі не прадуць.
А субота ды радзіцельска.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.
Субота ды радзіцельска,
А нядзеляй я к абедзенке пайшла,
Так і ўся мая нядзелечка прайшла.
Кудзеля, кудзеля мая,
засталася недапрадзеная.

Дарэчы, як расказалі нам удзельнікі калектыву, у Барані ёсць мясцовая адметнасць у святкаванні Каляд. Тут не водзяць казу, а замест гэтага віншуюць па-свойму: маладая пара ходзіць на Шчодры вечар па вёсцы і каго сустракае, таго запрашае да сябе на аладкі. А потым усе збіраюцца ў хаце тых, хто запрашаў, і святкуюць з песнямі і танцамі, частуюцца хатнімі прысмакамі… Наогул да абрадаў тут ставяцца беражліва, але разам з тым імкнуцца рабіць усё магчымае, каб яны былі запатрабаванымі і сёння — некаторыя перакладаюць, спрабуюць дадаваць нешта сваё. Таму і на вяселлях калектыў заўсёды жадаюць бачыць з выступленнямі. Артысты з «Крынічанькі» могуць маладых і песнямі павіншаваць, і вясельны марш сыграць. А бывае, што маладым дарогу пераходзяць. Вясельная традыцыя называецца першай, потым яшчэ некаторыя жанчыны далучыліся. З часам у нашым калектыве з'явіліся дзве Зінаіды: Сімчанка і Іваноўская. Яны прыйшлі ў адзін дзень, недзе праз год пасля пачатку нашага існавання. У нас яны пасябравалі і да сёння засталіся. Мужчыны ў нас спяваюць ужо недзе гадоў па сямнаццаць. У 1996 годзе нам прысвоілі званне «народны»,— успамінае кіраўнік ансамбля Вячаслаў Шпакоўскі, які падтрымлівае і ў маладога, і ў старэйшага пакалення любоў да беларускай народнай песні. Ён таксама ездзіць па Аршаншчыне ў фальклорныя экспедыцыі, дбайна шукае новыя песенныя скарбы для рэпертуару. Некаторыя песні выконваюць з тых, што самі ад старэйшых родзічаў запомнілі. А адной нават пахваліліся: маўляў, яе іх кіраўнік сам напісаў:

Я хаджу па лузе,
лузе зеляненькім,
Там гуляюць дзеўкі,
а я маладзенькі.
А я, маладзенькі,
на дзевак паглядаю,
Там збірае кветкі Кася маладая.
Я ёй усё маргаю, а яна рагоча,
Са мной, маладзенькім,
яна гуляць не хоча.
Сяду я на каня, каня варанога
Ды паеду ў сваты
да бацькі старога
Ды бацьку старому
ў ножкі пакланюся:

«Аддай за мяне Касю,
адразу ажанюся!»
«Ёсць жаніх у Касі
стары і багаты,
А ты маладзенькі,
але беднаваты».
Кажа Кася бацьку:
«Не люблю старога,
Аддай мяне, бацька,
за хлопца маладога».
На Пакроў гулялі
ўсім сялом вяселле
Пілі мёд-гарэлку
людзям на здзіўленне…

Што тут казаць — лепш шчыра парадавацца, што жывуць на зямлі беларускай людзі — такія таленавітыя, працавітыя, апантаныя сваёй справай. І напярэдадні Новага года, калі мы часта ўскладваем надзеі на лепшае, хочацца пажадаць, каб кожны з нас памятаў, як важна захоўваць і паважаць сваё мінулае…

Алена ДРАПКО.
Фота аўтара.

«зайцы»: артысты кажуць маладым слова на дарогу, а потым праз ручнік прапускаюць іх далей вяселле святкаваць…

Гэта сёння некаторыя да вяселля не заўсёды сур'ёзна ставяцца і дзяўчаты любяць лічыць сябе незалежнымі, а здаўна вялося, што мужчына — апора ў сям'і і яе карміцель. Як у наступнай песні:

А Божа мой!
Толькі аборачкі тонкі;
Ніхто замуж не бярэ,
аборачак не псуе.
Мой мужык Дамінік —
яго розум не вялік,
Як была я дзеўкай,
цяпер маладзічка.
Добра быць за мужам
ды не за п'янічкай,
Сякі-такі, абы быў,
солі хлеба каб купіў.
Сякі-такі мужчына,
за мной дровы і лучына.
(саліруюць мужчыны)
Як за яго завалюся,
я нікога не баюся.
А Божа мой!
Толькі аборачкі тонкі;
Ніхто замуж не бярэ,
аборачак не псуе.

Калектыў «Крынічанька» быў заснаваны ў 1988 годзе. «Я тады працаваў на нашым заводзе «Чырвоны кастрычнік» і мяне запрасілі ў ансамбль. Прывёў з сабой некалькі чалавек, якія таксама любілі беларускую народную песню. Святлана Аладзева прыйшла

■ Тэлесеткі

Яна свята набліжае і настрой паляпшае

Усіх прыхільнікаў беларускай народнай творчасці зноў чакаюць новыя фальклорныя экспедыцыі. У бліжэйшыя выхадныя, 21 снежня, будзем слухаць народны ансамбль народнай песні «Бліскавіца» са Шклова і ўзорны фальклорны калектыў «Шчодрыкі» з вёскі Барань Аршанскага раёна. А вось з удзельнікамі народнага ансамбля народнай музыкі і песні «Крынічанька» з гэтай жа мясцовасці пазнаёміцца будзе магчымасць ужо ў апошнюю нядзелю адыходзячага года — 28 снежня.

Шклоўшчына здаўна славілася вырошчваннем агуркоў і іх багатым ураджаем. І з 2006 года ў Шклове ладзяць свята — Дзень агурка, а ў 2007-м тут нават адкрылі помнік яму. Стварыў скульптуру магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў і імя жартаўліваe прыдумаў «Агуродзец». Важыць ён, між іншым, 300 кілаграмаў. Ужо з першых дзён свайго існавання скульптура пачала абрастаць легендамі. Так, лічыцца, калі маладыя патруць адначасова кветачку, што знаходзіцца ў руках у агурка, то ў гэтым жа годзе ў іх народзіцца дзіця. А хочаце фінансавага дабрабыту, тады пацерці трэба грашовыя купюры ў кішэні. Пры жаданні ж мець добры ўраджай дакранаемся да агуркоў у кошыку і кідаем туды семкі. Аднак не толькі гэтым славіцца Шклоў. З гэтай зямлёй звязаны імёны, напрыклад, беларускага музыканта Міхаіла Гузікава. Ім быў удасканалены беларускі народны інструмент брусочкі, які з'яўляецца папярэднікам сучаснага ксілафона. Гастраляваў ён са сваім інструментам па Бельгіі, Францыі, Германіі. Музыказнаўца Шлёзінгер у 1836 годзе ў Вене выдаў кнігу «Міхаіл Гузікаў і яго інструмент з дрэва і саломы»...

Сёння ў Шклове таксама шмат людзей, якія праяўляюць цікавасць да беларускай народнай творчасці. Народны ансамбль народнай музыкі і песні «Бліскавіца», які існуе з 1995 года, таксама з такіх. Чым адметны гэты калектыў і што цікавае яшчэ ёсць на шклоўскай зямлі, глядзіце ўжо ў гэтую нядзелю. А яшчэ слухайце новую версію аўтэнтычнай песні, якую выконвае Вера Карэтнікава.

З вёскай Барань, яе паданнямі, легендамі, традыцыямі і песеннымі калектывамі знаёмства будзе адбывацца паступова — спачатку «Шчодрыкі» (гэта дзіцячы калектыў), а потым «Крынічанька» парадуюць нас сваімі набыткамі рэпертуару. У спецыяльным святочным выпуску з падвядзеннем вынікаў года будуць і сюрпрызы. Гасцямі праграмы выступяць Тэа і Кірыл Ермакоў. І ў нядзелю 28 снежня пасля прагляду праграмы «Наперад у мінулае» вам гарантаваны добры перадсвяточны настрой.

Алена ДРАПКО

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ!

Падчас правядзення чарговай рэкламнай гульні «Звязда» разыграе сярод падпісчыкаў **лічбавыя тэлевізійныя рэсіверы** і суперпрыз — **тэлевізар LG з дыяганаллю 99 см.**

Што трэба для таго, каб выйграць? Як заўсёды — падпісацца на газету на 1-ы квартал альбо 1-е паўгоддзе і, запоўніўшы картку ўдзельніка гульні, даслаць яе ў рэдакцыю (падрабязная інфармацыя аб правілах — у нумары за 26 лістапада).

Заставайцеся са «Звяздой»!

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або 1-е паўгоддзе 2015 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на I кв. або 1-е паўг. 2015 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) (індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ШЫБАВАЎ ЖАБРАК ДА МУРА

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь-3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:

- ✓ **Жабра́к** — вельмі бедны чалавек.
- ✓ **Заці́рка** — мучная поліўка на вадзе ці малацэ. У Змітрака Бядулі ёсць апавяданне з назвай «Пяць лыжак заціркі».
- ✓ **Шыбава́ць** — хутка, імкліва ісці. «Міхал злез з воза, кінуў вокам, у двор шыбуе мерным крокам», — пісаў у паэме «Новая зямля» Якуб Колас.
- ✓ **Грэ́баваць** — гідліва ставіцца да чагонебудзь. «Юля не грэбавала ніякай работай», чытаем у Міколы Лобана.
- ✓ **Фіра́нка** — тканевая заслона на вокны, дзверы. Слова «фіранка» ёсць і ва ўкраінскай мове.
- ✓ **Мур** — каменная або цагляная сцяна. «Ізноў я тут, сярод муроў, паміж астрожных сцен праклятых» — радкі Максіма Танка.
- ✓ **Дзясятая вада на кісялі** — так кажуць пра вельмі далёкага сваяка. Рускі аналаг — «нашему забору двоюродный плетень», «нашему слесарю двоюродный кузнец», па-беларуску яшчэ могуць сказаць — «сёмая вада на кісялі».
- ✓ **Хоць вазамі вазі** — вельмі шмат. Рускі аналаг — «хоть косой коси», «пруд пруди». Беларускія варыянты — «хоць граблямі грабі», «хоць касу закладвай».

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

УСЕ ПАДВОДЗЯЦЬ ВЫНІКІ

Да свята застаецца яшчэ амаль паўтара тыдня, але тэлеканал АНТ абяцае стварыць гледачам адпаведны настрой загадзя. Перадnавагодні музычна-забаўляльны марафон пачнецца ўжо ў бліжэйшую суботу.

Так, **20 снежня** адбудзецца апошні адборачны канцэрт Нацыянальнай музычнай прэміі **«Ліра»**. Зрэшты — сюрпрыз! — ён будзе не апошнім. Дадатковы выпуск, складзены з самых яркіх нумароў удзельнікаў, і шанц падтрымаць любімых выканаўцаў чакайце **27 снежня**.

Таксама **20 снежня** гранд-фіналам завершыцца чарговы сезон інтэлектуальнага клуба **«Што? Дзе? Калі?» у Беларусі»** і вызначыцца ўладальнік Вялікай хрустальнай савы. Усім аматарам мудрагелістых і каверзных задачак для розуму глядзець абавязкова. Таксама прыхільнікам інтэлектуальных гульняў варта не прапусціць фінал **«Брэйн-рынга»** — апошнія гульні III чэмпіянату свету па гэтай гульні, у якім удзельнічалі 25 камандаў з 6 краін, у тым ліку з Беларусі, пройдуць 28 снежня.

Традыцыйнае падвядзенне вынікаў года на айчыннай эстрадзе адбудзецца падчас вялізнага канцэрта **«Песня года»**, які выйдзе ў эфір у дзвюх частках, **25 і 26 снежня**. А ўвечары 26 снежня вырашыцца яшчэ адна інтрыга, якая трымала ля экранаў пэўнае кола гледачоў цягам апошніх месяцаў — пройдзе фінал музычнага шоу **«Голас»**.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 22 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 00.10 Зона Х.
09.10 Галоўны эфір.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 «Зорнае жыццё». «Апантаныя працай».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
12.10, 13.50 Меладрама «Пацалунак лёсу».
15.50 Меладрама «Я падару сабе цуд».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.30 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
20.00 Форум.
21.00 Панарама.
21.45 Серыял «След».
23.55 Актуальнае інтэрв'ю.
0.50 Дзень спорту.
1.00 Фантастыка «Людзі Ікс-2».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 10.05, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 Серыял «Сашка».
10.35 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.05 Серыял «Мама — дэтэктыў».
12.15 Серыял «Баффі — знішчальніца вампіраў».
14.40 «Разбуральнікі міфаў».
15.40 «Comedy Баттл». Без межаў».
17.50, 00.00 Серыял «Таксі».
18.50 Серыял «Універ».
19.55 Камедыя «Сяброўства народаў».
20.55 Цела чалавека.
21.25 КЕНО.
21.35, 00.30 Трылер «Прывіды».
22.50 Серыял «Віртуозы».
23.55 Хачу ў тэлевізар!

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 13.45, 19.20, 00.15 «Калейдаскоп».
8.10, 18.00 «Дыя@блог P.S.».
8.40 «Рыцар без даспехаў». Драма.
10.20, 23.00 «Культурны праменад».
11.00 «Не пакідай...» Дзіцячы фільм. 1-я і 2-я серыі.
13.20 «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Не пакідай...».
14.00 «Падарожжа мсье Перышона». Камедыя.
15.15 «Камертон». Дырэктар Дзяржаўнага Эрмітажа Міхаіл Пятроўскі.
15.40 «Завяшчанне слуцкай княгіні». Дак. фільм.
16.05 «Кола». Кароткаметражны фільм.
16.25 «Негульня ў бісер». Творчасць мастачкі-лялечніцы Ганны Балаш.
16.50 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Драма.
18.25 «Пані Мяцеліца». Фільм-казка.
19.35 «Шынель». Драма.
20.45 «Калыханка».
21.10 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
22.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
22.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
23.35 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Кацярына Варкалава.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 0.55 PRO спорт. Навіны.
8.00, 20.10 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Масстарт. Мужчыны.
8.55 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Астана» — «Цмокі-Мінск».
10.30, 21.05 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Масстарт. Жанчыны.
11.30 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Арсенал».
13.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгэмптан» — «Эвертан».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Астан Віла» — «Манчэстэр Юнайтэд».
16.50 Гандбол. SEHA-ліга. «Заграб» (Харватыя) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
18.15 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Крыстал Пэлас».
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сток Сіці» — «Чэлсі».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Жыла-была «Ёлачка». Загадка песні».
19.00 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Маст. фільм «Джобс. Імперыя спакусы».
0.30 «Вячэрні Ургант».
1.10 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Мінскчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.45 «Вялікае снеданне».
10.40 «Мае цудоўныя...».
11.40 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.50 «Вялікі горад».
14.30 «Зорны рынг. Бітва хітоў». «Кактэйль» супраць «Ліяна і тры малпы».
15.45 «Дарагая перадача».
16.20 «Наша справа».
16.50 «Следакі».
17.30 «Далёкія сваякі».
17.45 Маст. фільм «Старыя-разбойнікі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «З Парыжа з каханнем».
22.00 «Глядзець усім!».
23.00 «Тыдзень спорту».
23.30 «Ваенная тайна».

МІР

6.00 «180 хвілін».
8.45 «Беларусь сёння».
9.10, 0.40 Маст. фільм «У старых рытмах».
10.30 Маст. фільм «Аднойчы ў Новы год».
12.10 Дак. серыял «У свеце ежы».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05, 2.15 Серыял «Іншы свет».
15.30 Серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
16.20 Ток-шоу «Слова за слова».
17.10 Серыял «Развітальнае рэха».
19.20, 4.10 Серыял «Метад Лаўровай».
22.00 Маст. фільм «Курортны туман».
23.40 «Навіны (бягучы радок) культуры».
0.30 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
2.45 Маст. фільм «Без мужчын».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Карціна свету».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Прамы эфір».
12.50 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.10 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Залатое дно Ахоцкага мора».
16.40 «Касманаўтыка».
17.15 «Уся Расія».
17.50 Серыял «Сэрца зоркі».
18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.50 Серыял «Па гарачых слядах».
21.50, 23.20 Серыял «Браты па абмене».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.20 «Пракурорская праверка».
9.30, 10.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.55 «Суд прысяжных».
13.30 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.40 «Справа густу».
15.10 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.00 Серыял «Чужы».
22.55 Анатомія дня.
23.40 Маст. фільм «Рэпартаж лёсу».

8 КАНАЛ

7.00, 13.25, 18.55, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 «Сёння бярэцца».
8.00 Камедыя «Дарога дадому».
9.30 Серыял «Айцец Браўн».
10.30 «Вясельны перапалох».
11.00 Драма «Каралеўскі раман».
13.30 Серыял «Чарцяня».
15.15, 18.40 «Тэлемагазін».
16.25 «Золата маўчання».
16.45 Серыял «Эўрыка».
17.35 «Навіны».
17.45 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».
19.00 Серыял «Рака».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Забароненае каханне».
23.10 Серыял «Прыгарад».

ВТВ

6.00 «Play».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.30 Серыял «Вароніны».
9.30, 13.30, 19.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
10.00 «Кіно ў дэталях».
11.00 «Навагодні тыдзень ежы».
12.00 Серыял «Аманда О».
13.00 Серыял «Супер Макс».
14.00 «Знаёмцеся, мужчына!».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00 Фантастыка «Міф».
18.30 «Лаві момант».
20.00 Серыял «Кухня 4».
21.10 Мюзікл «У рытме сэрца».
23.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «Зачараваныя».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.10 Навіны культуры.
10.15 «Наглядальнік».
11.15 Серыял «Расследаванні камісара Мегрэ».
12.00 «Сусветныя скарбы культуры».
12.15 Успамінаючы Мікалая Пастухова. «Эпізоды».
12.55, 22.40 Дак. серыял «Апостралы». «Фама».
13.20 Маст. фільм «Як вам гэта падабаецца».
15.10 Academia. Алег Караблёў. «Марс і Венера».
16.00 Дак. фільм «Аляксандр Кайданоўскі. Недатыкальны».
16.50 Дак. фільм «Роберт Фолкан Скот».
17.00 Зоркі сусветнай опернай сцэны. Ёнас Каўфман.
18.05 75 гадоў Леа Бакерыя. «Лінія жыцця».
19.15 Галоўная роля.
19.30 «Саці. Нясумная класіка...» з групай «Кватро».
20.10 «Правілы жыцця».
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 Дак. серыял «Заўтра не памрэ ніколі». «Асцярожна! Паветра».
21.20 «Тым часам».
22.10 «Уладзімір Васільеў. Вялікі балет». Фільм 1-ы. «Пачатак. Мае настаўнікі».
23.30 Актуальнае кіно з Марынай Разбежкінай. Дак. фільм «Адзіная роля суперзоркі».
0.40 Канцэрт Ёнаса Каўфмана і аркестра Мюнхенскага радыё пад кіраваннем М. Гютлера.
1.40 Дак. фільм «Забыты бой ля мыса Сарыч».
2.25 В.А. Моцарт. Сімфонія №40.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
6.35 «Што? Дзе? Калі?». Тэлевізійная гульня. Сезон 1983—1984 гг.
7.40, 13.55 Навагодні канцэрт з Маскоўскага дзяржаўнага Тэатра эстрады. 1992 год.
8.25 Ансамбль «Бярозка». Канцэртная праграма. 1962 год.
9.00 Кінаканцэрт «Зніму рыцара, або Рыцары не здаюцца!». 1987 год.
10.00, 16.00 Маст. фільм «Рыжы, сумленны, закаханы».
11.15 Фільм-канцэрт «Гады мірных здзяйсненняў». «Анталогія савецкай песні». 1977 год.
12.00 «Музычны кіёск». 1988 год.
12.35 «Аншлаг? Аншлаг!». 1991 год.
14.25 Канцэрт замежнай эстрады.
14.50 Фільм-канцэрт «На дзве гадзіны раней». 1967 год.
17.15 Дак. фільм «Любоў Арлова».
18.00 «...Да 16 і старэйшым». «Тэлефон даверу». 1989 год.
18.50 «Конкурс у краме «Мелодыя». 1981 год.
19.40 «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль «Знак Саламандры». 1984 год.
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
23.00 «Песня-82». 1-я частка.
0.00 Дак. фільм «Хто дыктуе моду?». 3-я частка.
0.30 Фільм-канцэрт «Вячэрнія мелодыі». 1985 год.
1.20 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі». 1985 год.
4.00 «Колба часу».
5.05 Фрагменты праграмы «Кінапанарама». 1969 год. 1-я частка.

EUROSPORT

10.30, 15.15, 18.00, 2.45 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету.
11.30, 19.00 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
12.15 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
13.00 Біятлон. Кубак свету. Жанчыны. Гонка пераследу.
13.45 Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
14.30 Біятлон. Кубак свету. Мужчыны. Гонка пераследу.
16.00 Лыжныя гонкі.
17.00 Біятлон. Кубак свету.
19.30, 22.15, 02.00 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
20.45 Футбол. Еўрагалы.
21.30 All Sports.
22.00 WATTS.
23.45 Конны спорт. Коннае скачковае шоў (канкур). Гран-пры.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.15, 14.35, 17.30, 22.00, 3.10 Серыял «Дваццаць дванаццаць».
7.00 Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».
8.40 Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
11.15 Камедыя «А як жа Боб?».
12.55 Камедыя «Шпіён па суседстве».
15.35 Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
18.35 Камедыя «Таксі 2».
20.20 Камедыя «Таксі 3».
21.45, 0.55, 2.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
23.10 Прыгоды «Ас з асаў».
1.15 Камедыя «Лары Краўн».
4.10 Камедыя «Паўторны шлюб».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.50, 18.50, 2.15 Серыял «Каханне і пакаранне».
9.25, 04.25 Дак. серыял «Па справах непаўналетніх».
11.15, 17.50 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.15 «Свая праўда».
13.20 Серыял «Аўрора».
14.20 «Жонка. Гісторыя кахання».
15.45, 22.50, 03.35 «Зорныя гісторыі».
16.50 «Шчырая размова».
20.40 Серыял «Двайное жыццё».
21.50, 01.30 Серыял «Пацук».
23.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
0.35 «Часова даступны».

ТБ1000

6.10, 12.30 Баявік «Гісторыя рыцара».
8.30 Мюзікл «У рытме сэрца».
10.20 Баявік «Дзікая рака».
14.50 Камедыя «Як па масле».
16.30 Трылер «Добры доктар».
18.10 Трагікамедыя «Пакуль вечкам не накрыўся».
20.00 Камедыя «Сем псіхапатаў».
22.10 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
0.10 Камедыя «Я завязаў».
2.00 Драма «Добрай ночы і ўдачы».
4.00 Баявік «Машына часу».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Пісьмы мёртвага чалавека».
7.50 Фільм-казка «Агонь, вада і... медныя трубы».
9.20 Камедыя «2 дні».
11.00 М/ф «Карлік Нос».
12.30 Драма «Царское паляванне».
14.55 Драма «Папса».
16.55 Меладрама «Прагулка па Парыжы».
18.25 Камедыя «Адно каханне на мільён».
20.20 Камедыя «Джэнтльмены, ўдачы!».
22.05 Камедыя «Зімовы сон».
23.55 Трагікамедыя «Не думай пра белых малпаў».
2.00 Драма «Дом з вежкай».
3.25 Меладрама «Мегаполіс».
4.55 Драма «З каханымі не расставайцеся».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
7.00 Гульні розуму.
8.00 Займальная навука.
9.00, 14.00 Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
10.00, 15.00 Зона 51: Сакрэтныя файлы ЦРУ.
11.00 Аўтарэстаўратары.
12.00 Мегазаводы.
13.00, 19.00 Скарбашукальнікі.
16.00 Сіла племені.
17.00 Экстрэмальнае падарожжа.
18.00, 3.00 Паветраныя асы вайны.
20.00 Грашовае сховішча ЗША.
21.00, 1.00, 4.00 Міжнародны аэрапорт Дубай.
22.00, 2.00, 5.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
0.00 У пагоні за НЛА.

DISCOVERY

8.00, 10.35 Залатая ліхаманка.
8.50 У пагоні за класікай.
9.40, 14.15, 21.35 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.40, 21.05, 5.45 Як гэта зроблена?
11.30, 6.10 Звышчалавечая навука.
12.25, 17.25 Каралі аўкцыёнаў.
13.20, 1.55 Top Gear.
15.10, 4.55 Хуткія і гучныя.
16.05, 7.05 Вялікі махінатар.
17.00 Махінатары.
18.20 Як пабудаваць суперкар.
19.15 Анаконда: з'едзены жыўцом.
20.10 Не спрабуйце паўтарыць.
22.00 Аляска: сям'я з лесу.
23.00 Скаваныя.
0.00 Голыя і напалоханыя.
1.00, 4.05 Паляўнічыя на рэлікві.
2.50 Сапраўдныя аферысты.
3.40 Маланкавыя катастрофы.

АЎТОРАК, 23 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.05** Навіны.
7.05, 08.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.25 Зона Х.
09.10, 21.45 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Меладрама «Шчасліўчык Пашка».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «На шляху да сэрца».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 01.35 Серыял «Сваты 4».
17.30 Беларуская часінка.
19.20, 00.45 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
23.50 Вечар цяжкага дня.
1.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.10 «Fitnews».
10.45 «Разбуральнікі міфаў».
11.50, 22.55 Серыял «Віртуозы».
12.55 Ікра.
13.25, 18.50 Серыял «Універ».
14.35, 19.55 Камедыя «Сяброўства народаў».
15.35 «Comedy woman».
17.50, 0.05 Серыял «Таксі».
20.55 Цела чалавека.
21.25 Спортлато 6 з 49.
21.30 КЕНО.
21.40, 0.35 Трылер «Прывіды». Заключная серыя.
0.00 Хачу ў тэлевізар!

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.40, 18.45, 0.25 «Калейдаскоп».
8.15 «Шынель». Драма.
9.25, 17.05 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
9.50 «Вянок санетаў». Драма.
11.15 «Адступнік. Валерый Рубінчык». Дак. фільм.
11.35 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Кацярына Варкалава.
12.15, 23.55 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі Міхаіла Пятрова.
12.55 «Волга-Волга». Камедыя.
14.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
15.00 «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Дзмітрыя Калдуна.
16.00 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Драма.
17.30 Шлягеры на ўсе часы. «Джаз і класіка». Канцэрт Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
19.00 «Пан афарміцель». Драма.
20.45 Калыханка.
21.10 «Вясельны падарунак». Меладрама.
22.30 «Дыя@блог». «Пра мову».
22.55 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Уладзімір Александровіч і яго сябры.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 0.50 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
8.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Сток Сіці» — «Чэлсі».
10.50 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Жанчыны.
12.20 Хакей. Ароса Чэледж. Славакія — Беларусь.
14.15 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Спрынт. Мужчыны.
15.50 Гандбол. SEHA-ліга. «Нексе» (Харватыя) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
17.20 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэасапіс.
17.55 Спорт—кадр.
18.25 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва» (Мінск).
20.40 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА (Расія) — «Цмокі-Мінск» (Беларусь).
22.20 Чэмпіянат свету па кікбоксінгу.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «ЗАГС».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Прыгажунчык».
23.15 Маст. фільм «Гарбун».
1.10 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Тыдзень спорту».
9.35 «Такі лёс».
10.40 «Мае цудоўныя...».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 Маст. фільм «Сіроп».
15.35 «Татальны распродаж».
16.50 «Следакі».
17.30 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Школа зладзеяў».
22.10 «Глядзець усім!».
23.00 «Разумней не прыдумаеш. «Белы сезон».
0.00 «Аўтапанарама».
0.20 Серыял «Энігма».

МІР

6.00 «180 хвілін».
8.45 «Агульны інтарэс».
9.10, 0.40 Маст. фільм «Жорсткі раманс».
12.10 Дак. серыял «У свеце ежы».
13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15 Серыял «Дарогі Індыі».
15.05 Серыял «Іншы свет».
15.30 Серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
16.20, 23.40 Ток-шоу «Слова за слова».
17.10 Серыял «Развітальнае рэха».
19.20 Серыял «Метад Лаўровай».
22.00 Маст. фільм «Анёл праляцеў».
0.30 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
3.25 Маст. фільм «Чытальнік».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Краснадарскі спрут. Карупцыя па-савецку».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Прамы эфір».
12.50 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.10 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Бэкфайр», «Б'юці» і іншыя. Сто гадоў далёкай авіяцыі».
16.40 «Факты».
17.15 «Уся Расія».
17.50 Серыял «Сэрца зоркі».
18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».
20.50 Серыял «Па гарачых слядах».
21.50, 23.20 Серыял «Браты па абмене».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.20 «Пракурорская праверка».
9.30, 10.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.55 «Суд прысяжных».
13.30 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.40 «Справа густу».
15.10 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.00 Серыял «Чужы».
22.55 Анатомія дня.
23.40 Серыял «Чалавек ніадкуль».

8 КАНАЛ

07.00, 12.55, 18.55, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
07.05, 16.00 Мультпарад.
07.30 Камедыя «Перажыць Каляды».
09.00 «Кінаблакнот».
09.15, 17.35 «Навіны».
09.25, 15.15 «Тэлемагазін».
09.45 Серыял «Айцец Браўн».
10.40 Баявік «Моцны арэшак».
13.00 Серыял «Чарцяня».
14.45 «Кулінарныя парады».
16.30 «Кінаблакнот».
16.45 Серыял «Эўрыка».
17.45 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».
18.40 «Тваё здароўе».
19.00 Серыял «Рака».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.10 Камедыя «Вар'яцкае вяселле».
23.05 Серыял «Прыгарад».

ВТВ

6.00, 3.00 «Play».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.10, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.30 Серыял «Варонiны».
9.30, 13.30, 19.00 Серыял «Адноічы ў міліцыі».
10.00, 20.00 Серыял «Кухня 4».
11.00 «Навагодні тыдзень ежы».
12.00 Серыял «Аманда О».
13.00 Серыял «Супер Макс».
14.00 «Знаёмцеся, мужчына!».
15.00, 1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00 Мюзікл «У рытме сэрца».
18.30 «Лаві момант».
21.10 Меладрама «(Не)чаканы прынц».
23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.00 «Дурні і дарогі».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.10 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Наглядальнік».
11.15 Серыял «Расследаванні камісара Мегрэ».
12.00, 16.40 «Сусветныя скарбы культуры».
12.15 Успамінаючы Таццяну Самойлаву. «Астравы».
12.55, 22.40 Дак. серыял «Апосталы». «Сімон і Фадзей».
13.20, 0.00 Маст. фільм «Оскар Уайльд».
15.10 Academia. Аляксандр Базілеўскі. «Юпітэр, Сатурн, Уран, Нептун і іх спадарожнікі».
16.00 «Саці. Нясумная класіка...» з групай «Кватро».
17.00 Зоркі сусветнай опернай сцэны. Чэчылія Бартолі.
18.05 Юбіляры года. Аляксандр Філіпенка. Лінія жыцця.
19.15 Галоўная роля.
19.30 Штучны адбор.
20.10 «Правілы жыцця».
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 Дак. серыял «Заўтра не памрэ ніколі». «Антыбіётыкі, або Помста мікробаў».
21.20 Дак. фільм «Джота дзі Бандоне».
21.25 «Гульня ў бісер». «Мікалай Забалоцкі. Лірыка».
22.10 «Уладзімір Васільеў. Вялікі балет». Фільм 2-і. «Наперадзе планеты ўсёй».
23.30 «Прыгажосць скрытага». Гісторыя сподняй сукенкі з Рэнатай Літвінавай. Фільм 1-ы.
1.35 С. Рахманінаў. Сюіта для двух фартэпіяна.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Музычны кіёск». 1988 год.
6.35 «Аншлаг? Аншлаг!». 1991 год.
7.55, 1.40 Навагодні канцэрт з Маскоўскага дзяржаўнага Тэатра эстрады. 1992 год.
8.25, 20.40 Канцэрт замежнай эстрады.
8.50 Фільм-канцэрт «На дзве гадзіны раней». 1967 год.
10.00, 4.00 Маст. фільм «Рыжы, сумленны, закаханы».
11.15 Дак. фільм «Любоў Арлова».
12.00 «...Да 16 і старэйшым». «Тэлефон даверу». 1989 год.
12.50 «Конкурс у краме «Мелодыя». 1981 год.
13.40 «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль «Знак Саламандры». 1984 год.
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
17.00, 23.00 «Песня-82».
18.00 «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока: Група «Дзіўныя гульні». 2-я частка.
19.00 Фільм-канцэрт «Вячэрнія мелодыі». 1983 год.
19.30 М/ф «Вушасцік і яго сябры».
19.40 Спектакль Тэатра імя Массавета «Эдзіт Піяф». 1-я серыя. 1983 год.
0.00 «Ранішняя пошта». 1986 год.
0.35 «Што? Дзе? Калі?». Тэлевізійная гульня. Сезон 1983—1984 гг.
2.25 Ансамбль «Бярозка». Канцэртная праграма. 1962 год.
3.00 Кінаканцэрт «Зніму рыцара, або Рыцары не здаюцца!». 1987 год.
5.15 Фільм-канцэрт «Гады мірных здзяйсненняў». «Анталогія савецкай песні». 1977 год.

EUROSPORT

10.30 Футбол. Еўрагалы.
11.15 Біятлон. Кубак свету.
12.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
13.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
14.00 Конны спорт. Скокі. Агляд тыдня.
14.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
15.00 Горныя лыжы. Паказальнае выступленне.
16.30 Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
16.45 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Жанчыны.
17.45 Тэніс. Адкрыты турнір ЗША. Фінал. Жанчыны.
18.45, 22.30 Тэніс. «Матс пойнт».
19.15 Тэніс. Адкрытае першынство Аўстраліі. Фінал. Мужчыны.
20.15 Тэніс. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Фінал. Мужчыны.
21.30 Тэніс. Адкрыты турнір ЗША. Фінал. Мужчыны.
23.00, 2.45 All Sports.
0.00 Аўтагонкі. Гонка «24 гадзіны Ле Мана».
1.00 Аўта- і мотаспорт.
1.20 Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.10, 14.40, 17.30, 3.10 Серыял «Дваццаць дванаццаць».
7.00 Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
8.35 Камедыя «Шпіён па суседстве».
11.10 Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
13.05 Камедыя «Таксі 2».
15.40 Прыгоды «Ас з асаў».
18.35 Камедыя «Таксі 3».
20.20 Прыгоды «Фантамас супраць Скотланд-Ярда».
22.00 Серыял «Вялікая школа». 1 серыя.
23.10 Камедыя «Загадана ажаніць».
0.55, 2.50, 5.45 Скетчком «Паміж намі».
1.15 Камедыя «А як жа Боб?».
4.10 Камедыя «Лары Краўн».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.05, 14.10 «Доктар І...».
7.40, 18.55, 2.10 Серыял «Каханне і пакаранне».
9.15, 4.25 Дак. серыял «Па справах непаўналетніх».
11.10, 17.50 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.10, 16.50 «Шчырая размова».
13.10 Серыял «Аўрора».
14.45, 0.40 Серыял «Каменская».
15.45, 22.55, 3.35 «Зорныя гісторыі».
20.45 Серыял «Двайное жыццё». Заключная серыя.
21.55, 1.25 Серыял «Пацук».
23.55 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.00 Камедыя «Мільён для чайнікаў».
7.50 Меладрама «Бяспека не гарантуецца».
9.20 Драма «Добрай ночы і ўдачы».
11.00 Мюзікл «У рытме сэрца».
12.40 Камедыя «Я завязаў».
14.30 Баявік «Машына часу».
16.10, 02.00 Камедыя «Кошкімышкі».
18.05 Фантастыка «Паралельныя светы».
20.00 Драма «Глыбокае сіняе мора».
21.45 Драма «Вялікія надзеі».
0.00 Трылер «Крумкач».
4.10 Камедыя «Віхор».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Верабей».
8.10 Драма «Вышыня 89».
10.10 Камедыя «Падарунак з характарам».
12.00 Камедыя «Дон Сезар Дэ Базан».
14.40 Драма «Жыві і памятай».
16.30 Баявік «Спіраль».
18.20 Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
20.20 Камедыя «Сябры сяброў».
22.10 Камедыя «Навагодняя жонка».
0.00 Трагікамедыя «Рэпетыцыі».
2.00 Камедыя «2 дні».
3.45 Драма «Царскае паляванне».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
7.00 Гульні розуму.
8.00 Займальная навука.
9.00, 14.00, 20.00 Міжнародны аэрапорт Дубай.
10.00, 15.00, 23.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
11.00 Аўтарэстаўратары.
12.00 Мегазаводы.
13.00, 19.00 Скарбашукальнікі.
16.00 Дзікія жывёлы Поўначы.
17.00 Экстрэмальнае падарожжа.
18.00, 3.00 Паветраныя асы вайны.
21.00, 1.00, 4.00 Больш чым фокусы.
22.00, 2.00, 5.00 Кіраванне натоўпам.
0.00 У пагоні за НЛА.

DISCOVERY

8.00, 10.35 Залатая ліхаманка.
8.50, 13.45 Хуткія і гучныя.
9.40 Як гэта ўстроена?
10.10, 5.45 Як гэта зроблена?
11.30, 6.10 Забойныя дылемы.
12.25 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.20 Махінатары.
23.00 Мяцежны гараж.
0.00 Легендарны аўтамабіль.
1.00, 4.05 Склады: бітва ў Канадзе.
1.55 Top Gear.
2.50 Сапраўдныя аферысты.
3.40 Маланкавыя катастрофы.
4.55 У пагоні за класікай.
7.05 Вялікі махінатар.

■ Тэлесеткі

Хто трапіць у «аўстрыйскі дэсант»?

Праз тыдзень адбудзецца фінал нацыянальнага адборачнага тура міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2015».

Як расказалі «Звяздзе» ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, ужо праведзены шэраг сустрэч арганізатараў праекта з фіналістамі, дзе папярэдне былі абмеркаваны тэхнічныя і творчыя пажаданні да шоу, якое адбудзецца 26 снежня. На пачатку наступнага тыдня пачнецца мантаж сцэны, дэкарацый, светлавога, гукавога і піратэхнічнага абсталявання, неабходнага для выступленняў, устаноўка плазменных панэляў і дадатковай здымачнай тэхнікі ў студыі.

Расслабляцца артыстам няма калі: 24 і 25 снежня ў іх адбудуцца індывідуальныя рэпетыцыі і... апошняя магчымасць падкарэктаваць свае нумары, каб паказаць іх публіцы і суддзям у найбольш выйгрышным святле. Генеральныя ж рэпетыцыі ў рэжыме прамога эфіру прызначаны на вечар 25-га і дзень 26-га снежня, непасрэдна перад шоу.

Дарэчы, пазнаёміцца бліжэй з кожным з 15 фіналістаў сёлетняга адбору гледачы могуць у праграмах «Добрай раніцы, Беларусь!», «Eurovision. За кадрам» і «Eurovision. Вынікі тыдня», а таксама ў спецыяльных сюжэтах «Панарамы» і «Прамога эфіру». Можна праслухаць яшчэ раз і конкурсныя кампазіцыі — у эфіры ўсіх радыёстанцый Белтэлерадыёкампаніі.

Ужо вядома, што весці фінальнае шоу (яго змогуць убачыць гледачы «Беларусь 1» і «Беларусь 24», а таксама ўсе ахвотныя ў анлайн-рэжыме на афіцыйным сайце конкурсу eurovision.tv) будуць Вольга Рыжыкава і Дзяніс Дудзінскі. А вось імёны ўдзельнікаў прафесійнага журы, якое будзе выстаўляць ацэнкі фіналістам, трымаюцца ў найстражэйшым сакрэце і будуць названы толькі перад пачаткам гала-канцэрта.

Нагадаем, пераможца нацыянальнага адбору будзе вызначаны адначасова па выніках ацэнак гледачоў і суддзяў. Пры гэтым да абвяшчэння агульных вынікаў галасавання журы не будзе ведаць, як ідзе галасаванне глядацкае. Вынікі ж плануецца падвесці па формуле 7+1, дзе 7 ацэнак — балы, выстаўленыя кожным з суддзяў, 1 — балы, якія аддалі ўдзельніку гледачы. У астатнім ніякіх новаўвядзенняў няма: хто набярэ найбольшую колькасць сумарных балаў — той і перамог.

Дарэчы

Са сваімі прадстаўнікамі на конкурсе вызначыліся ўжо 6 краін: Бельгія, Македонія, Мальта, Нідэрланды, Сан-Марына і Чарнагорыя. Усяго ж, як чакаецца, у 60-м міжнародным песенным конкурсе возьмуць удзел артысты і калектывы з 39 краін. Сярод тых, хто па розных прычынах не заявіўся на конкурс у 2015 годзе — Босния і Герцагавіна, Славакія, Турцыя, Украіна і, магчыма, Балгарыя.

Тым часам першая партыя білетаў на шоу 2015 года, якая паступіла ў продаж, была раскуплена фанатамі за 20 хвілін. Наступную партыю арганізатары шоу абяцаюць запусціць у рэалізацыю ў студзені.

За творчую пуцёўку ў Аўстрыю сёлета спаборнічаюць гурты Napoli, Muzzart, Rostany, MILKI, «Беатрыс», салісты прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Дарыя і Аляксей Грос, дуэт Юзары і Маймуна, Дзяніс Ліс, Гюнеш, пераможца тэлепраекта «Акадэмія талентаў. Трэці курс» Валерыя Садоўская, Жанет, Віталь Варанко, Настасся Малашкевіч, Tasha ODI. Чым збіраюцца здзіўляць і ўражваць публіку і суддзяў артысты, «Звязда» раскажа больш падрабязна ў суботнім нумары ■

СЕРАДА, 24 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.10 Зона Х.
9.10 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Меладрама «Шчаслівучык Пашка».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «На шляху да сэрца».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 00.45 Серыял «Сваты 4».
17.30 Беларуская часінка.
19.20 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Святочная Калядная Імша з Мінскага архікафедральнага касцёла Дзевы Марыі. Прамая трансляцыя.
23.45 Калядная служба з Ватыкана з удзелам Папы Рымскага Францыска І.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.10 Беларуская кухня.
10.45, 0.10 «Разбуральнікі міфаў».
12.00 Серыял «Віртуозы».
13.05 Вышэй за дах.
13.40, 18.50 Серыял «Універ».
14.50, 19.55 Камедыя «Сяброўства народаў».
15.50 Рэпарцёр.
17.50, 23.40 Серыял «Таксі».
20.55 Цела чалавека.
21.25 Спортлато 5 з 36.
21.30 КЕНО.
21.40 Меладрама «Шукаю нявесту без пасагу».
23.35 Хачу ў тэлевізар!

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!»
8.00, 13.05, 19.10, 0.10 «Калейдаскоп».
8.15 «Пан афарміцель». Драма.
9.55, 17.45 «Дыя@блог». «Пра мову».
10.20 «Вясельны падарунак». Меладрама.
11.40 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Уладзімір Александровіч і яго сябры.
12.40, 23.45 «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Аляксея Кузьміча.
13.20 «Музеі Беларусі». Музей гісторыі Мінска.
13.45 «Наперад у мінулае».
14.10 «Наша спадчына». Пояс караля Стэфанія Баторыя.
14.25 «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Галубіцкая пушча».
14.50 «Шчасце берагчы». Андрэй Макаёнак.
15.20 «Дзелавыя людзі». Герой капіталістычнай працы.
15.40 «Навагодні тыдзень». Сольны канцэрт Ірыны Дарафеевай.
16.40 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Драма.
18.15 «Свінг белых начэй». Гала-канцэрт Пецярбургскага фестывалю джаза.
19.20 «Жанчыны жартуюць усур'ёз». Камедыя.
20.45 Калыханка.
21.00 «Яшчэ кахаю, яшчэ спадзяюся». Меладрама.
22.20 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
22.45 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Зімовы калейдаскоп.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 1.25 PRO спорт. Навіны.
8.00 Спорт—кадр.
8.30 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва» (Мінск).
10.30 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. ЦСКА (Расія) — «Цмокі-Мінск» (Беларусь).
12.10 Козел пра футбол.
9.20 «Чыстая праца».
10.00 «Іншая краіна». «Дзіўная Паўднёвая Афрыка, або Бусел насарогу — таварыш?».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
12.40 Маст. фільм «Экіпаж».
15.15 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.50 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.25 «Разумней не прыдумаеш. «Белы сезон».
20.00 «СТБ спорт».
20.10 Маст. фільм «Любовь-морковь 3».
22.00 «Зорны рынг. Бітва хітоў». «PEPPERS» супраць «Gentle Beat».
23.15 «Дак. праект»: «Зямля. У пошуках стваральніка».
0.10 Маст. фільм «Бітлджус».

МІР

6.00 М/ф.
7.45 «Зямля і неба».
8.10 «Саюзнікі».
8.35 «Сабака ў доме».
9.00 «Эксперыментатары».
9.30 «Ой, мамачкі».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Любімыя акцёры».
10.40 Маст. фільм «Лятучая мыш».
13.05 Маст. фільм «Гісторыя Одры Хёпберн».
15.35 Серыял «Іншы свет».
16.15 Маст. фільм «Вялікая перамена».
21.00 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».
23.25 Маст. фільм «Кекс у вялікім горадзе».
0.55 Маст. фільм «Кінгсайз».
2.50 Маст. фільм «Інтэрдзяўчынка».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.45 Маст. фільм «Лекі для бабулі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.20 «Суботнік».
12.00 «Планета сабак».
12.35 Маст. фільм «Сватаўство гусара».
14.25 Серыял «Мора па калена».
16.20 «Гэта смешна».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.30 Камедыя «Вяселля не будзе».
22.20 Маст. фільм «Слабая жанчына».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 Серыял «Гончыя».
6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.50 «Урачэбныя тайны плюс».
9.20 «Справа густу».
10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
10.20 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».
16.20 Камедыя «Прызначана ўзнагарода».
18.05 «Следства вялі...».
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
20.05 «Новыя рускія сенсацыі».
21.10 «Філіп-кароль. Як гэта было».
22.35 «Тэхналогія бяссмерця».
23.35 «Тайны кахання».
0.30 «Мужчынская годнасць».

8 КАНАЛ

9.00, 13.45, 19.00, 21.00, 23.50 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.15 Прыгоды «Смурфікі».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
13.50 Прыгоды «Ледзяныя дрыжыкі».
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.35 Меладрама «Прынцэса на Каляды».
18.05 Серыял «Эўрыка».
19.05 Меладрама «Прынцэса спецый».
20.50 «Вечарніца».
21.10 «Фэшн is my прафэшн».
21.20 Трылер «Пачатак».

ВТБ

6.00 «Play».
8.00 «Галоўныя людзі».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 02.00 «Турбаміксерам».
12.00 «Сябры на кухні».
12.30 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».
15.00 «Навагодні Задорны юбілей». Канцэрт М. Задорнава. Частка 2.
17.00 Баявік «Таксі 4».
19.00 Скетчком «Сям'я 3D».
21.00 Камедыя «ALL INCLUSIVE, або Усё ўключана».
23.10 Скетч-шоу «6 кадраў».
23.30 «Без вежы».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Нерэальная гісторыя».
1.30 «Людзі ХЭ».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Біблейскі сюжэт.
10.35 Маст. фільм «Сабака на сене».
12.50 Вялікая сям'я. Ягор Канчалоўскі.
13.45 Пернікавы домік. «Паўночны роспіс».
14.15 Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі».
14.45 «80 гадоў Мікалаю Слічэнку. «Тэатральны летапіс. Выбранае».
15.30 Спектакль тэатра «Ромэн» «Мы — цыганы». Запіс 1986 года.
16.55 «75 гадоў Эмануілу Вітаргану. «Лінія жыцця».
17.50, 1.55 Дак. фільм «Жыццё па законах стэпаў. Манголія».
18.45 «Рамантыка раманса». «Песні нашага кіно».
19.40 Маст. фільм «Памылка інжынера Кочына».
21.30 «Хлопец з Таганкі. Фільм-маналог Уладзіміра Высоцкага».
22.25 «Наглядальнік». Уладзіміру Высоцкаму прысвячаецца...
23.25 Кіно на ўсе часы. Маст. фільм «Тысяча акраў».
1.15 «Джаз на сямі вятрах».
2.50 Дак. фільм «Жуль Верн».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Ранішняя пошта».
6.35 Міхаіл Задорнаў. «Навагоднія фантазіі». 1993 год.
7.35 Тэлеспектакль «Паміж небам і зямлёй». 1977 год.
8.35, 13.15, 1.25 Канцэрт замежнай эстрады.
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00 Сольны канцэрт Глорыі Гейнар. 1979 год.
11.40, 5.40 М/ф для дарослых. «Касмічныя прышэльцы».
12.00 Дак. фільм «Ганна Герман. Лёс і песні».
13.05 М/ф «Зачараванае слова».
13.40 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі». 1985 год.
16.00 «Колба часу».
17.00 «Кінапанарама». 2-я частка. 1969 год.
18.00 «Пад знакам задыяка». «Стралец». 1993 год.
19.30 Канцэрт «Парад зорак». 1993 год. 1 частка.
20.20 «Зорная гадзіна». Навагодні выпуск. 1993 год.
21.00 Кінаканцэрт «Зоркі замежнай эстрады і кіно вітаюць вас!». 1987 год.
22.05 Маст. фільм «Тэатр». Па матывах аднайменнага рамана С. Моэма. 1-я серыя.
23.15 Канцэрт «Залаты шлягер». 1994 год.
0.00 Дак. фільм «Вяршыня Візбара».
1.50 Спектакль Тэатра імя Массавета «Эдзіт Піяф». 2-я серыя. 1983 год.
2.45 «Маленькі канцэрт». 1989 год.
5.00 «Песня-82». 3-я частка.

EUROSPORT

10.30 WATTS.
13.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
14.45 Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
15.00, 02.15 Скачкі на лыжах з трамплінаў. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
19.45 Біятлон.
22.00 Байцоўскі клуб.
00.00 Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
00.15 Баявыя майстэрствы.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.05, 14.35 Серыял «Вялікая школа».
7.00 Прыгоды «Фантамас супраць Скотланд-Ярда».

8.40 Камедыя «Сцэны ў краме».
11.05 Камедыя «Каханне з акцэнтам».
12.50 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
15.35 Баявік «Кілеры».
17.25, 22.00 Серыял «Я і місіс Джонс».
18.25 Камедыя «Бацька нявесты».
20.20 Камедыя «Бацька нявесты-2».
23.10 Камедыя «Цёрнер і Хуч».
0.50 Скетчком «Паміж намі».
1.15 Баявік «Няўдачнікі».
3.10 Серыял «Дваццаць дванаццаць».
4.10 Камедыя «Загадана ажаніць».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.00, 05.15 «Дом дагары нагамі».
11.00 «Хронікі маскоўскага быту».
11.55 «Гісторыі выратавання».
12.30 «Вундэркінды. Гора ад розуму».
13.05, 03.15 «Таямніцы нашага кіно. «Вам і не снілася...».
13.40, 03.45 Маст. фільм «Вам і не снілася...».
15.30 «Альфонсы. Каханне па правілах і без».
16.25 «Свая праўда».
17.30, 01.55 Дак. фільм «Імя. Зашыфраваны лёс».
19.05 «Даўно не бачыліся!».
20.20 Маст. фільм «Чалавек каля акна».
22.15 Маст. фільм «Прытулак».
0.20 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.00 Камедыя «А вось і Полі!».
7.40 Баявік «Круты і цыпачкі».
9.25, 14.20 Жахі «Ідэнтыфікацыя».
11.00 Камедыя «Джэк і Джыл: каханне на чамаданах».
12.30 Меладрама «Здзелка».
15.55 Камедыя «Каханне: інструкцыя па прымяненні».
18.05 Камедыя «Горад і вёска».
20.00 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
22.00 Драма «Гавана, я люблю цябе».
0.15 Камедыя «Сем псіхапатаў».
2.10 Драма «Дваццаць адно».
4.10 Драма «Мушкецёры».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Падарунак з характарам».
8.05 Камедыя «Джэнтльмены, ўдачы!».
9.55 Камедыя «Правадыр разнаскурых».
11.35, 03.15 Драма «Маладая жонка».
13.20 Камедыя «Зімовы сон».
15.10 Камедыя «Тарыф Навагодні».
16.40 Камедыя «2 дні».
18.20 Драма «Папса».
20.20 Камедыя «Ёлкі 2».
22.10 Камедыя «Навагодні шлюб».
0.00 Камедыя «Зімовы сон».
1.55 Меладрама «Будзь са мной».
4.55 М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
7.00 Скарбашукальнікі.
8.00 Аб'ект сусветнай спадчыны.
9.00 Навука будучыні.
10.00 Космас: Прастора і час.
11.00 Гульня ў лікі.
12.00, 21.00, 1.00, 4.00 Больш чым фокусы.
13.00 Храм фашызму.
14.00 Генералы.
15.00 Кенгуровы хаос.
16.00 Дзікая прырода Амазонкі.
17.00 Чужыя светы.
18.00, 23.00, 2.00, 5.00 Кіраванне натоўпам.

DISCOVERY

8.00 Як гэта ўстроена?
8.25, 15.35 Хуткія і гучныя.
9.15 Аляска: сям'я з лесу.
10.10, 17.25, 3.40 Голыя і напалоханыя.
11.05 Дамы на дрэвах.
12.00, 7.05 Паляўнічыя на рэлікві.
12.50 Склады: бітва ў Канадзе.
13.45, 6.10 Дарога да прыбытку.
14.40 Мяцежны гараж.
16.30 Легендарны аўтамабіль.
22.00 Анаконда: з'едзены жыўцом.
0.00 Трой.
1.00 Інструкцыя па стварэнні.
1.55 Як пабудаваць суперкар.
2.50 Каралі сталярнай справы.
4.30 Стальныя мышцы.
5.20 Маланкавыя катастрофы.
5.45 Як гэта зроблена?

■ Zамор'е

ПРАПАНОВА-3: КРУШЭННЕ ДАХУ

Гісторыі з прапановамі мужчынамі рукі і сэрца сваім каханым у канцы года становяцца ўсё больш незвычайнымі і, можна сказаць, маштабнымі. Што там кітаец і брытанец са сваімі айфонамі і авечкамі, у гэты раз вылучыўся галандзец, і як! Жадаючы ўзяць шлюб, мужчына праламаў кранам дах дома! Двойчы!

Жыхар галандскага горада Ійсельстэйн спрабаваў з дапамогай арандаванага крана з'явіцца перад акном спальні сваёй дзяўчыны і зрабіць ёй прапанову. Кран не быў замацаваны, і яго страла ўпала проста на дах суседняга будынка. Калі тэхніку паспрабавалі падняць, яна павалілася зноў, выклікаўшы яшчэ большыя разбурэнні. Жыхары бліжэйшых дамоў былі эвакуяваныя, пацярпелых няма. Але самае цікавае тое, што абранніца няўдачлівага арыгінала адказала яму згодай!

«ПАСТРЫГУ», — СКАЗАЎ ЁН, АГАЛЯЮЧЫ МЕЧ

А ў гэтага цырульніка, думаю, трэба сядзець, як статуя, інакш можна не далічыцца вуха. В'етнамскі майстар стрыжкі і завіўкі Нгуен Хаанг Хунг праславіўся тым, што працуючы ў салоне прыгажосці, ён памайстэрску стрыжэ сваіх кліентаў, выкарыстоўваючы для гэтага… самурайскі меч — катану.

Хунг, натуральна, ніколі не быў самураем, але тым не менш ён па-майстэрску ўмее ўпраўляцца з вострым мячом. Ён ім стрыжэ. І не толькі ім. Каля чатырох гадоў таму Хунг удзельнічаў у конкурсе, дзе яму неабходна было падстрыгчы чалавека, выкарыстоўваючы для гэтага ручную пілу, што яму паспяхова ўдалося зрабіць. Пасля ён вырашыў практыкавацца ў стрыжцы валасоў пры дапамозе катаны. Трэніраваўся на парыках, але потым яго майстэрства дасягнула такіх вышынь, што цяпер ён можа ствараць стрыжкі любой даўжыні пры дапамозе гэтага мяча, вядомага сваёй вастрынёй. Яго ўменне па-майстэрску кантраляваць лязо мяча не можа не здзіўляць. Цяпер у яго няма адбою ад ахвотнікаў адчуць на сваіх валасах лязо катаны. А вы рызыкнулі б так пастрыгчыся?

МАЕ ДАРАГІЯ

Жыхарка Вялікабрытаніі Стэфані Марыям выдаткавала на калядныя падарункі для сваіх сабак дзве тысячы фунтаў (каля трох тысяч долараў).

Шпіцам Харві Мун і Коні дасталіся аброжкі, інкруставаныя крышталямі «Свароўскі», дзве раскошныя ляжанкі для святочнай каляднай вячэры, а таксама адзенне, цацкі і іншыя аксесуары. Марыям распавяла, што сабакі вельмі любяць Раство. «Мы дорым сваім шпіцам менавіта тое, што яны хочуць. Любоў, абдымкі, ежу і, вядома, трохі стыльных рэчаў», — заявіла дзяўчына. Паводле слоў гаспадыні жывёл, яна траціць на сябе вельмі мала грошай, таму лічыць магчымым песціць сваіх гадаванцаў. Адзначаецца, што раней у гэтым годзе дзяўчына выдаткавала на вечарынку для сваіх сабак каля 16 тысяч долараў. Стэфані жыве з бацькамі, якія падтрымліваюць захапленне 21-гадовай дачкі. Дзяўчына працуе інструктарам па танцах.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

■ Гэта цікава

БАГЕМЫ НАПОЙ

У свой час ён быў улюбёным напоем усёй багемы. У сваіх творах яго апявалі Дэга (карціна «Абсэнт»), Ван Гог, Пікаса, Уайльд, Э. Манэ, Эдгар По і іншыя. Пікаса намаляваў карціну «Келіх абсэнту» і стварыў бронзавую скульптуру на гэтую тэму, а Чарльз Фолі паставіў п'есу пад назвай «Абсэнт».

Напоі на аснове палыну існавалі яшчэ ў старажытнасці, але канчаткова рэцэпт абсэнту сфарміраваўся ў канцы XVIII стагоддзя. Яго аўтарам лічыцца нейкая мадам Энрыа з Швейцарыі, якая гатавала настойку на палыне. Абсэнт часцей за ўсё мае смарагдава-зялёны колер, але таксама можа быць празрыстым, жоўтым, сінім, карычневым, чырвоным або чорным. Зялёны колер напою абумоўлены хларафілам.

Першапачаткова абсэнт, зроблены на аснове палыну, з'яўляўся лекавым сродкам і нібыта лячыў ад шматлікіх хвароб, за што яго называлі «La Fee Verte» — «Зялёная Фея». Другая мянушка — «Зялёная ведзьма». Папулярнасць абсэнту рэзка ўзрасла падчас французскіх каланіяльных войнаў у Паўночнай Афрыцы, якія пачаліся ў 1830 годзе. Ваенным выдавалі пэўную колькасць абсэнту для прафілактыкі малярыі, дызентэрыі і іншых хвароб, а таксама для дэзынфекцыі пітной вады, і ён трывала ўвайшоў у французскае вайсковае жыццё. У той жа час у войсках Паўночнай Афрыкі сталі ўсё часцей сустракацца выпадкі параналдальнай шызафрэніі. З 1880 года абсэнт трывала асацыяваўся з шызафрэніяй, пакутамі і смерцю. Яго называлі «вар'яцтвам у бутэльцы». Хапала і трагічных гісторый, звязаных з гэтым напоем. Самая вядомая з іх — справа швейцарскага фермера Джына Ланфрэя ад 1905 года, які, выпіўшы вялікую колькасць абсэнту, расстраляў усю сваю сям'ю. Забойцу асудзілі, а абсэнт у краіне забаранілі.

Эфект ад ужывання абсэнту можа быць самым разнастайным: спакойнае расслабленне, незвычайная бадзёрасць, эйфарыя, раптоўны смех, агрэсія, галюцынацыі, парушэнне зроку, змена колераў. У ходзе доўгіх даследаванняў напою высветлілася: прычынай яго адмоўнага ўплыву на чалавечы мозг з'яўляецца рэчыва туён, якое змяшчаецца ў экстракце палыну. У наш час абсэнт зноў легалізавалі, але з агаворкай на тое, што колькасць туёну не будзе перавышаць заканадаўча вызначаныя нормы. Таму шматлікія вытворцы адмовіліся ад палыну і замянілі яго іншай травой, напрыклад, белым і зорчатым кітайскім анісам.

Доктар Пол Вульф даказаў, што празмерная прысутнасць жоўтага колеру ў карцінах Ван Гога — гэта наступствы празмернага прыёму абсэнту і дыгаксіну, якім ён лячыў эпілепсію. Віной усяму ўсё той жа туён, перадазіроўка якога скажае ўспрыманне колеру, і чалавек пачынае бачыць усё ў жоўтых тонах. Пад уздзеяннем туёну і дыгаксіну мастак і напісаў сваю вядомую карціну «Зорная ноч», на якой вакол зорак намаляваныя вялікія жоўтыя кругі.

У сучасных барах рытуал ужывання абсэнту крыху спрасцілі, а вось раней цырымонія распіцця гэтага напою была цэлым мастацтвам. На келіх з абсэнтам змяшчалі спецыяльную лыжку (сярэбраны падсітак), на якую клалі кавалачак трысняговага цукру. Цукар надаваў абсэнту трохі салодкасці. Затым на яго лілі халодную ваду, і абсэнт набываў жаўтаваты колер і станавіўся гусцейшым.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

НЯДЗЕЛЯ, 28 СНЕЖНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.05 Камедыя «Залатыя нажніцы».
8.50 Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Святой Сям'і.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.20 Серыял «Цуд».
10.45 «Пра ежу!».
11.20 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х». Вынікі тыдня.
13.10 Тайны следства.
13.50 Каробка перадач.
14.30 Eurovision. Вынікі тыдня.
14.50, 22.15 Вялікае тэлебачанне.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.20 «Вялікі рэпартаж».
16.55 Меладрама «Кватарантка».
18.45 Камедыя «Адзін дома 2: Згублены ў Нью-Ёрку».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.25 Камедыя «Каляды з няўдачнікамі».

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Вышэй за дах.
7.25 Камедыя «Санта Клаус-2».
9.15 М/с «Аватар. Легенда аб Ааанга».
10.05, 20.25 Тэлебарометр.
10.10 «Fitnews».
10.50 «Зразумець і абясшкодзіць».
11.25, 21.20 Серыял «Інтэрны».
13.05 Я хачу гэта ўбачыць!
13.40 Серыял «Мама — дэтэктыў». Заключныя серыі.
15.45 Фэнтэзі «Персі Джэксан і выкрадальнік маланак».
17.50 «Comedy Баттл». Без межаў».
19.15 Суперлато.
20.05 Кіпень.
21.00 Спортлато 5 з 36.
21.05 КЕНО.
23.00 Ток-шоу «Перазагрузка».
23.45 «Сустрэча з ...» Наталля Батракова.
0.15 Хакей для ўсіх.

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.40, 15.55, 0.25 «Калейдаскоп».
8.15 «Байран». Драма. 1-я і 2-я серыі.
10.40 «Подых струн». Музычная праграма. Лепшыя бардаўскія песні 2014 года.
11.20 «Наперад у мінулае».
11.50 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
12.55 «Дзелавыя людзі». Гісторыя пошты.
13.15 «Мама». Дак. фільм.
13.40 «І смех, і бяда». Кароткаметражны фільм.
14.20 «Свет прыроды». Лясны прыгажун.
14.30 «Свет прыроды». Маленькі зімовы сюжэт.
14.50 Творчы вечар народнага артыста Расіі Аляксандра Міхайлава.
16.10 «Руслан і Людміла». Фільм-казка. 1-я і 2-я серыі.
18.30, 22.15 «Культпрасвет».
19.05 «Вялікі вальс». Драма.
20.45 Калыханка.
21.10 «Жорсткі раманс». Музыка Андрэя Пятрова.
22.50 «Камедыянт». Спектакль. Часткі 1-я і 2-я.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 3.10 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
8.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Рыга).
10.50 Мастацкая гімнастыка. Baby Cup.
12.55 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Юнацтва» (Мінск) — «Дынама» (Маладзечна).
15.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Манчэстэр Юнайтэд».
17.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Саўтгэмптан» — «Чэлсі».
19.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ньюкасл» — «Эвертан».
21.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Бёрнлі».
23.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Вест Хэм» — «Арсенал».
0.55 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Швейцарыя — Расія.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.20 «ТБ-таксі».
11.45 «Брэйн-рынг».
13.10 Маст. фільм «Сватаўство гусара».
14.25 Маст. фільм «Белыя Росы».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Цырымонія ўзнагароджання нацыянальнай прэміі «Народная марка».
18.00 Маст. фільм «Белыя Росы. Вяртанне».
20.00 Контуры.
21.05 «Ледніковы перыяд». Фінал.
23.50 «Што? Дзе? Калі?». Фінал.
1.00 «Легенды Live. «Sting».

СТБ

6.00 Маст. фільм «Любоў-морковь 3».
7.45, 17.45 «Аўтапанарама».
8.10 Маст. фільм «Джэк-снегавік».
10.00 «Вялікае снеданне».
10.40 «Тэрыторыя памылак».
11.35 Маст. фільм «Асаблівасці нацыянальнага паляванння ў зімовы перыяд».
13.00 «Прывітанне, доктар».
13.30 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.15 «На тым жа месцы ў той жа час».
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Дачка д'Артаньяна».
23.00 «Пякельная кухня-2».
0.20 Маст. фільм «Звяры дзікага Поўдня».

МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 М/ф.
6.40 Маст. фільм «Лятучая мыш».
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 Маст. фільм «Зіта і Гіта».
13.05 «Нітка да ніткі».
13.30 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».
16.15, 22.35 Серыял «Твой свет».
21.00 «Разам».
0.05 Маст. фільм «Вялікая перамена».
5.10 Дак. фільм «З нагоды. Водар кахання: Гісторыя парфумерыі».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Пакой смеху».
7.30 Маст. фільм «Слабая жанчына».
11.00, 14.00, 17.00 Вестк.
11.15 «Сам себе рэжысёр».
12.10 «Смехапанарама».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «У свеце жывёл».
14.15 «Кулінарная зорка».
15.15 Маст. фільм «Атэль для Папялушкі».
17.25 Фінал праекта «Гарады, якія спяваюць. Трэці сезон».
20.00 Вестк тыдня.
21.55 Фінал Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.
23.55 «Нядзельны вечар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 Серыял «Гончыя».
6.50, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Медыцынскія тайны».
9.25 «Ядзім дома».
10.20 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».
16.20 Камедыя «Прызначана ўзнагарода».
18.05 Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
19.00 «Сёння. Вынікавая праграма».
20.10 «Прафесія — рэпарцёр».
20.50 Дэтэктыў «Сугней».

8 КАНАЛ

9.00, 13.00, 18.55, 21.00, 23.40 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.50 «Адшукваецца адпачынак».
10.25 Баявік «Цёмны бок месяца».
13.05 Камедыя «Прышэльцы ў Амерыцы».
14.35 Камедыя «Калядная пяцёрка».
16.10 «Вясельны перэпалах».
16.40 «МакаShow-10».
16.50 «Сёння бярэцца».
17.20 «Тэлемагазін».
18.00 Серыял «Эўрыка».
19.00 Драма «Хаціка — самы верны сябар».
20.50 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Палёт».

ВТВ

6.00 «Play».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі. Нявесты».
10.00, 2.00 «Турбаміксерам».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00 «Свята без ахвяраў».
14.00 «Кіно ў дэталях».
15.00 Скетчком «Сям'я 3D».
17.00, 23.10 Скетч-шоу «6 кадраў».
17.30 Камедыя «ALL INCLUSIVE, або Усё ўключана».
19.30 «Уральскія пельмені».
21.00 Камедыя «Усё ўключана 2».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 «Людзі ХЭ».
0.30 «Лаві момант».
1.00 «Без вежы».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 Да 75-годдзя Эмануіла Вітаргана. Маст. фільм «Набожная Марта».
12.55 «Легенды сусветнага кіно». Анатоль Ктораў.
13.25 Расія, любоў мая! «Камчацкія каракі. Падзяка агню».
13.50 Геніі і ліхадзеі. «Луі Жан Люм'ер — Томас Эдысан. Нясканчаная вайна».
14.20, 0.25 Дак. фільм «Белы мядзведзь».
15.10 Дзіцячы хор Расіі, Валерый Гергіеў і сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра. Канцэрт у Марыінскім-2.
16.35 «Пешшу...» Масква дойліда Казакова.
17.00 Юбіляры года. Вячаслаў Шалевіч. Лінія жыцця.
18.00 «Кантэкст».
18.40, 1.55 «Шукальнікі». «Загадка Меднага вершніка».
19.25 Да 70-годдзя Вялікай Перамогі. «Вайна на ўсіх адна».
19.40 Маст. фільм «Гарбата з Мусаліні».
21.30 У гасцях у Эльдара Разанава. Творчы вечар Сяргея Салаўёва.
22.40 «Каралева чардаша». Ганна Нятрэбка і Хуан Дыега Флорэс у навагоднім гала-канцэрце. Прамая трансляцыя з Дрэздэна.
1.20, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
1.35 М/ф для дарослых: «Дару табе зорку», «Ён і Яна».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 Дак. фільм «Ганна Герман. Лёс і песні». 1988 год.
7.05 М/ф «Зачараванае слова».
7.15, 21.35, 2.35 Канцэрт замежнай эстрады.
7.40 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі». 1985 год.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
11.00 «Кінапанарама». 2-я частка. 1969 год.
12.00 «Пад знакам задыяка». «Стралец». 1993 год.
13.30, 19.45 Канцэрт «Парад зорак». 1993 год.
14.20 «Зорная гадзіна». Навагодні выпуск. 1993 год.
15.00 Кінаканцэрт «Зоркі замежнай эстрады і кіно вітаюць вас!». 1987 год.
16.05, 22.00 Маст. фільм «Тэатр». Па матывах аднайменнага рамана С. Моэма.
17.15 Канцэрт «Залаты шлягер». 1994 год.
18.00 «Навагодні каляндар». 1965 год.
19.00 Канцэрт групы «Машына часу». 1990 год.
20.30 Музыка ў эфіры. Навагодні выпуск. 1991 год.
23.15 Фрагменты навагоднягa «Блакітнага агеньчыка». 1970 год.
0.00 «Ранішняя пошта».
0.35 Міхаіл Задорнаў. «Навагоднія фантазіі». 1993 год.
1.35 Тэлеспектакль «Паміж небам і зямлёй». 1977 год.
4.00 «Народжаныя ў СССР».
5.00 Сольны канцэрт Глорыі Гейнар. 1979 год.
5.40 М/ф для дарослых. «Касмічныя прышэльцы». 2-я серыя.

EUROSPORT

3.15, 16.15 Біятлон.
10.30, 17.15, 23.30, 02.15 Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
11.00 Зімовыя віды спорту. Скі-пас.
11.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
11.45, 15.00, 20.30, 1.00 Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
13.00, 01.45 WATTS.
13.15 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
21.30 Бокс. Чэмпіянат Свету ВБО. А. Абрахам (Германія) — P. Smith (Злучанае Каралеўства).

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.05, 3.10 Серыял «Вялікая школа».
7.00 Камедыя «Сцэны ў краме».
8.25 Мюзікл «Дарога ў Рыа».
11.05 Баявік «Кілеры».
12.45 Камедыя «Бацька нявесты».
14.35, 17.25, 22.00 Серыял «Я і місіс Джонс».
15.35 Камедыя «Цёрнер і Хуч».
18.25 Камедыя «Бацька нявесты-2».
20.20 Камедыя «Цяжарны».
21.45, 0.55 Скетчком «Паміж намі».
23.10 Прыгоды «Янкі пры дварэ караля Артура».
1.15 Камедыя «Каханне з акцэнтам».
4.10 Баявік «Няўдачнікі».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.50, 5.10 «Дом дагары нагамі».
10.55 «Паненка і кулінар».
11.30, 02.25 Серыял «Таямніцы следства».
14.50 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.15 «Сто пытанняў даросламу».
17.10 «Без падману».
18.05 «Доказ віны».
18.40 Маст. фільм «Арсен Люпен».
21.10 Маст. фільм «Сапраўдная Макой».
23.15 «Асцярожна, махляры!».
23.50 «Часова даступны».
0.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.05 Камедыя «Горад і вёска».
7.55 Драма «Вялікія надзеі».
10.05, 17.55 Драма «Дваццаць адно».
12.10 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
14.10 Драма «Мушкецёры».
16.05 Фантастыка «Паралельныя светы».
20.05 Драма «8 міля».
22.00 Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
0.00 Драма «На самым дне акіяна».
2.00 Драма «Маленькія жанчыны».
4.10 Мюзікл «У рытме сэрца».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Дон Сезар Дэ Базан».
9.45 Камедыя «Свята пад замком».
11.10 Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
12.40 Камедыя «Вечары на хутары ля Дзіканькі».
14.00 М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».
15.25 Камедыя «Назад — на шчасце, або Хто знойдзе Сінюю птушку».
17.20 Меладрама «Каханне без страхоўкі».
19.00 Меладрама «Будзь са мной».
20.20 Камедыя «Ёлкі 3».
22.10 Камедыя «Сябры сяброў».
0.00 Фэнтэзі «Рэальная казка».
2.00 Драма «Мелодыя для катрынкі».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
7.00 Скарбашукальнікі.
8.00 Незвычайныя здабычы.
9.00 Навука будучыні.
10.00 Космас: Прастора і час.
11.00 Гульня ў лікі.
12.00, 19.00 Больш чым фокусы.
13.00 Дагістарычныя монстры Гітлера.
14.00 Генералы.
15.00 Анаконда: змяя-забойца.
16.00 Дзікая прырода Амазонкі.
17.00 Панарама 360°.
18.00 Кіраванне натоўпам.
20.00 Зрабі або памры.
20.30, 0.00 Секунды да катастрофы.
21.00, 2.00, 5.00 Катастрофа ў рэальным часе.
22.00, 3.00 Цунамі.
23.00, 1.00, 4.00 Мегацунамі: хто наступны?

DISCOVERY

8.00 Як гэта ўстроена?
8.25 Склады: бітва ў Канадзе.
9.15, 21.05 Каралі сталярнай справы.
10.10 Скаваныя.
11.05, 1.00 Стальныя мышцы.
12.00, 15.35, 23.00 Трой.
12.50 Як пабудаваць суперкар.
13.45 Зыход: тайны і загадкі.
14.40, 17.25, 22.00 Не спрабуйце паўтарыць.
16.30, 0.00, 3.40 Невытлумачальнае: спецыяльныя матэрыялы.
20.10, 4.30 Дамы на дрэвах.
1.55, 6.10 Легендарны аўтамабіль.
2.50 Аляска: сям'я з лесу.
5.20 Маланкавыя катастрофы.
5.45 Як гэта зроблена?
7.05 Мяцежны гараж.

Суседзі

Супрацоўніцтва на «Планеце ідэй»

PL-BY-UA 2007-2013

Гэты праект фінансуецца Еўрапейскім саюзам

Праект дзеля новых... праектаў

Ёсць цікавая ідэя. Але што патрэбна, каб яе ажыццяўленне стала як мага больш рэальным? Гэтаму прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання і турыстычных, грамадскіх арганізацый Польшчы, Украіны і Беларусі навучаюць дзякуючы міжнароднаму праекту «Планета ідэй». Чарговая сустрэча партнёраў з мэтай увасаблення існуючых задум у рэальныя праекты нядаўна адбылася на Гродзеншчыне.

Цікавых ідэй у самых розных сферах у кожным рэгіёне сапраўды шмат. Некаторыя з іх былі прэзентаваны на сустрэчы ў Каралінскім фальварку Тызенгаўза, які знаходзіцца ў Гродзенскім раёне. Пасля чаго ўдзельнікі праекта падзяліліся на групы для абмеркавання канкрэтных ідэй. Наладжваліся асабістыя сувязі, шукаліся варыянты яднання ў сумесным праекце таго, што ўжо напрацавана і хочацца зрабіць яшчэ ў кожным з рэгіёнаў.

А потым партнёры накіраваліся ў падарожжа па Гродзеншчыне (Шчучын — Ліда — Навагрудак), каб на свае вочы пабачыць тыя аб'екты, якія маюць перспектывы ў міжнародных праектах. У прыватнасці, пабывалі ў доме-музеі Чэслава Немэна ў Старых Васілішках, у Лідскім замку, на возеры Свіцязь, у музеі яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку... Акрамя таго, цікавыя праекты «саспяваюць» у Астравецкім, Свіслацкім, Слонімскім і іншых раёнах.

Дарэчы, у рамках «Планеты ідэй» такія сустрэчы адбыліся і на Валыні, Падляссі. Напрыклад, бургамістр Аўгустова Войцэх Валюлік адзначыў, што ён гатовы супрацоўнічаць з беларускім бокам па пытанні развіцця Аўгустоўскага канала і ўключэння яго ў спіс помнікаў ЮНЕСКА. Жаданне наладзіць кантакты з Гродзеншчынай выказаў і кіраўнік адміністрацыі гміны Супрасль Радаслаў Дабравольскі. Сярод варыянтаў партнёрства — развіццё музея праваслаўных абразоў у Супраслі і стварэнне турыстычнага маршруту, звязанага са старажытнымі цэрквамі абарончага тыпу ў Беларусі (Малое Мажэйкава, Сынкавічы) і Польшчы (Супрасль).

Удзельнікі «Планеты ідэй» абмяркоўваюць сумесныя праекты.

У кожным рэгіёне ёсць цікавыя напрацоўкі. Праўда, толькі наяўнасці перспектыўнай задумы не дастаткова — трэба ўмець грамотна яе ажыццявіць.

— Людзі часта думаюць, што калі ў іх ёсць суперпрыгожая ідэя, то яе адразу ж ацэняць і падтрымаюць фінансаваннем. Але гэта, калі казаць аб праектах трансгранічнага супрацоўніцтва, зусім не так. Трэба грамотна распрацаваць канцэпцыю, мерапрыемствы праекта, аформіць заяўку і абараніць яе, пераканаўшы міжнародны маніторынгавы камітэт, што ваша ідэя сапраўды вартая падтрымкі. І, зразумела, знайсці ў замежжы партнёра, чыя ідэя супадае з вашай. На гэта, каб дапамагчы сфарміраваць ідэю і адаптаваць яе да патрабаванняў праграм трансгранічнага супрацоўніцтва, і скіраваны праект «Планета ідэй», — зазначае яго **каардынатар Сяргей КАЛЯДА.**

Пакуль рана яшчэ казаць аб гатовых праектах, але некаторыя ідэі паступова пачынаюць увасабляцца ў даволі перспектыўныя прапановы. Напрыклад, на Шчучыншчыне, дзе нарадзіўся Чэслаў Немэн і ўсё большай папулярнасцю сярод турыстаў карыстаецца яго дом-музей, ужо праводзіліся культурныя імпрэзы, прысвечаныя знакамітаму музыканту. А ў Польшчы, у Сувалках ёсць вопыт блюзавага фестывалю. Але відавочна, што абодва кірункі патрабуюць далейшага развіцця, сучаснага сцэнічнага абсталявання.

Новыя ідэі патрабуюцца і для паляпшэння турыстычнай прывабнасці Лідскага замка. Тэмай міжнароднага праекта магло б стаць азнаямленне з перадавым вопытам у гэтай сферы, каб выкарыстаць яго і ў сябе.

Сумесны праект можа таксама атрымацца ў двух рэгіёнаў Украіны і Беларусі (Валыні і Навагрудчыны), дзе ёсць возера з аднолькавай назвай — Свіцязь. У нас, у зоне Свіцязянскага заказніка, цяпер ажыццяўляецца ідэя турысцка-экалагічнага цэнтра «12 месяцаў». Мяркуецца, што ён зацікавіць адпачывальнікаў не толькі ўлетку, але ў іншыя перыяды года — у прыватнасці, экалагічнымі сцяжынамі, праходжанне якіх будзе спалучацца з выкананнем спецыяльна распрацаваных заданняў, і паказам народных абрадаў, якія праходзілі на Навагрудчыне ў тым ці іншым месяцы. Дарэчы, на гэты цэнтр ужо ёсць праектна-каштарысная дакументацыя, што даволі важна для падтрымкі міжнародным праектам.

Цікавыя ідэі для сумесных праектаў ёсць і ў сферы воднага турызму. Іх прапануюць Астравецкі, Слонімскі раёны з надзеяй наладзіць супрацоўніцтва з польскімі і ўкраінскімі партнёрамі на трансгранічных рэках, якія яднаюць суседнія краіны. Прычым важна не толькі распрацаваць і на сучасным узроўні абсталяваць водныя маршруты, але і падрыхтаваць інструктараў, якія забяспечаць адпаведныя якасныя стандарты падарожжа і бяспеку аматараў актыўнага адпачынку.

Яшчэ адна тэма, дзе магчыма партнёрства ў сумесных праектах, — Першая сусветная вайна, тым больш што не за гарамі 100-годдзе яе заканчэння. Невыпадкова ў саставе польскай дэлегацыі на Гродзеншчыну прыехаў бургамістр мястэчка Монькі, дзе знаходзіцца Асавецкая крэпасць. Там ёсць жаданне правесці музеефікацыю аднаго з фартоў, які захаваўся лепш за іншыя. А ў нас у даволі някепскім стане знаходзіцца чацвёрты форт Гродзенскай крэпасці. Зноў жа існуе даўні намер стварыць там музейную экспазіцыю — сучасную, інтэрактыўную. Каб наведвальнікі, пабываўшы тут, маглі ўявіць атмасферу, зразумець трагедыю гэтай вайны. Зразумела, што да гэтага праекта павінна падключыцца і Смаргоншчына, якую ў свой час называлі рускім Вердэнам.

Прычым у рамках сумеснага праекта ў кожным рэгіёне можна стварыць не толькі музейныя экспазіцыі, але і гістарычныя рэканструкцыі, звязаныя з падзеямі Першай сусветнай вайны менавіта ў гэтай мясцовасці. Напрыклад, у Асаўцы ўжо даўно апавядаюць гісторыю так званай «атакі мерцвякоў». Калі рускія салдаты пасля газавай атакі, абкручаныя анучамі, са страшнымі ад вадыроў тварамі ішлі ў наступленне. Нямецкія войскі, не чакаючы, што застаўся нехта жывы і псіхалагічна не вытрымаўшы такога выгляду ворагаў, адступілі.

Праўда, узнікае пытанне: «Планета ідэй» завершыцца — і што далей? А потым — новыя ідэі, у прасоўванні якіх будзе дапамагаць сайт, створаны ў рамках гэтага праекта. Дзякуючы інтэрнэт-пляцоўцы кожны, хто жадае працаваць у міжнародных праектах, зможа абнародаваць сваю ідэю і, магчыма, знайсці партнёраў для яе рэалізацыі. Альбо падключыцца да работы над ідэямі, што прапануюцца іншымі. Вось такі «доўгайграючы» разлік «Планеты ідэй»...

Каля возера Свіцязь.

Наша даведка

Праект «Планета ідэй — трансгранічны трансфер ведаў у галіне прыцягнення інвестыцый для развіцця памежнага турызму» IPBU.03.01.00-58-602/11-00 рэалізуецца па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна» на 2007—2013 гг. З беларускага боку ў праекце ўдзельнічаюць упраўленне спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама, Гродзенскае абласное аддзяленне грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз» (галоўны партнёр), з польскага — цэнтр садзейнічання інавацыям і развіццю (г. Беласток), з украінскага — Валынскі фонд падтрымкі прадпрымальніцтва (г. Луцк).

Галоўнай мэтай праекта з'яўляецца ўмацаванне супрацоўніцтва паміж польскімі, беларускімі і ўкраінскімі органамі мясцовай улады, грамадскімі арганізацыямі і турысцка-інфармацыйнымі цэнтрамі ў галіне турызму. Мяркуецца, што ў выніку гэтых кантактаў, абмену карысным вопытам будуць створаны сумесныя праекты і падрыхтаваны адпаведныя заяўкі для ўдзелу ў конкурсе Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва.

Меркаванне ў тэму

Сяргей КАЛЯДА, каардынатар праекта «Планета ідэй»:

— Да праграм трансгранічнага супрацоўніцтва сёння стаўленне даволі пазітыўнае. Відавочна, што яны сябе апраўдваюць, паколькі ствараюцца партнёрскія адносіны паміж грамадзянамі суседніх краін і сумесныя прадукты ў розных сферах жыцця — не толькі турызму, але і аховы здароўя, адукацыі, культуры. Усё гэта ў інтарэсах устойлівага развіцця рэгіёнаў, іх інфраструктуры, эканомікі. І калі па заканчэнні праекта бачым, што тыя ідэі, якія ў яго ўкладваліся, працуюць ужо без вас, значыць, вы сваёй мэты дасягнулі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УНП 590373966

ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1».
Жилой дом № 4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями»,
опубликованной в газете «Звязда» № 159 от 23.08.2014.

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Московского района г. Минска» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении дополнения к проектной декларации по объекту «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1». Жилой дом № 4 по генплану со встроенно-пристроенными помещениями», опубликованной в газете «Звязда» № 159 от 23.08.2014.

Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для физических и юридических лиц предлагаются:

- помещение административно-торгового назначения между осями 7-9, А-Е общей площадью 125,27 кв.м стоимостью 4000 долларов США за 1 кв.м с НДС;

- помещение административно-торгового назначения между осями 14-16, А-Е общей площадью 72,48 кв.м стоимостью 4200 долларов США за 1 кв.м с НДС;

- помещение административно-торгового назначения между осями 30-32, А-Е общей площадью 73,33 кв.м стоимостью 4200 долларов США за 1 кв.м с НДС;

- кафе между осями 32-35, А-Е общей площадью 190,26 кв.м стоимостью 3700 долларов США за 1 кв.м с НДС.

Условия оплаты – первоначальный взнос в размере **30% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – до конца строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

При **единовременной** уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **100 долларам США**.

Стоимость помещения фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора. Стоимость 1 кв.м общей площади помещений указана без учета выполнения внутренних отделочных работ.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату перечисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

Документы для заключения договоров будут приниматься с **24.12.2014 по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20.** Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и КУДП «УКС Московского района г. Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 20, каб. 2, тел.: (017) 200-06-85, (044) 795-44-44.

УНП 190579681

■ Добрая навіна

СЯМ'Я НА НОВЫ ГОД

У рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» ў Магілёве плануецца адкрыццё дзіцячага дома сямейнага тыпу

Навасселле для 10 дзетак і іх бацькоў-выхавальнікаў адбудзецца ў будынку па вуліцы Жалезнякова ў Кастрычніцкім раёне горада. Як паведаміў намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ, для памяшкання набываецца неабходная мэбля і праводзіцца рамонт.

Наогул толькі ў Магілёве ў мерапрыемствах акцыі «Нашы дзеці» прымуць удзел каля 60 тысяч маленькіх жыхароў горада. Больш за 36 тысяч з іх — выхаванцы дашкольных устаноў, навучэнцы 1-4 класаў, дзеці-сіроты, дзеці, якія знаходзяцца ў дзіцячых прытулках, з малазабяспечаных і шматдзетных сям'яў, іншыя льготныя катэгорыі — атрымаюць падарункі за кошт гарадскога бюджэту. На гэтыя мэты выдаткавана каля 2,7 мільярда рублёў. З удзелам старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзіміра Цумарава пройдуць дабрачынныя акцыі — ранішнікі каля навагодняй ёлкі ў гарадскім цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі і абласным Палацы культуры, дзе збяруцца дзеці-сіроты, дзеці з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, тыя, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы.

Адной з яркіх падзей надыходзячых свят стане тэатралізаванае шэсце «Насустрач Новаму году», якое пройдзе 25 снежня. У ім прыме ўдзел больш за 200 Дзедаў Марозаў са Снягуркамі. Арганізатары абяцаюць відовішчнае прадстаўленне з элементамі фаер-шоу. Цікавым абяцае стаць карнавал, у якім можа прымаць удзел любы гараджанін. Дастаткова зрабіць заяўку ў гарадскі Цэнтр культуры і вольнага часу і паклапаціцца аб карнавальным касцюме.

1 студзеня на плошчы Зорак адбудзецца свята «Цуды Новага года» з песнямі з любімых мультфільмаў і сустрэчай з казачнымі героямі. А 13 студзеня абласны Палац культуры гасцінна запросіць на вялікі Калядны канцэрт і выставу творчых работ выхаванцаў дзіцячых школ мастацтваў Магілёва. Гарадская выставачная зала прадставіць магчымасць азнаёміцца з лепшымі дзіцячымі творамі падчас выставы «Зімовая фантазія».

— У горадзе робіцца шмат чаго для таго, каб стварыць для дзяцей і іх бацькоў спрыяльныя ўмовы жыцця, — адзначыў Андрэй Кунцэвіч. — На працягу года адкрыліся 2 дзіцячыя садкі — пасля рэканструкцыі на вуліцы Фаціна і новы ў маладзёжным мікрараёне Спадарожнік. Патрэба ў апошнім была вельмі вялікая, таму, нягледзячы на цяжкасці, якія ўзніклі з яго будаўніцтвам, аб'ект быў усё ж такі здадзены. Вялікая рэканструкцыя адбылася і ў радзільным аддзяленні Магілёўскай бальніцы №1, дзе дзверы расчыніла аддзяленне пасляродавага знаходжання маці і дзіцяці. Палаты абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. Значнай падзеяй не толькі для горада, але і для вобласці стала адкрыццё новага корпуса дзіцячай бальніцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■

■ Простая мова

ДОМ ПРЫ ДАРОЗЕ

…Горад, холад і часу вобмаль, таму подбегам да трамвая і адтуль — да метро.
Там, на ўваходзе, нейкі хлопец паперкі раздае, прычым не кожнаму…
Ужо ў вагоне дастала з кішэні сваю, паглядзела: чарговая прапанова. На гэты раз — камерцыйнай дзейнасці, з абяцаннем бясплатнага навучання, зручнага графіка, больш чым істотнага даходу… Каб лепш, карацей, дык і на халеру. Але ж — для некага…
Для мяне ў цыдулцы хіба… камплімент, бо першым радком там: «Запрашаем талковых людзей».

УСЕ НА ВЫСТАВУ!

Як вучылі калісь на журфаку, загаловак павінен (само сабой — адпавядаючы зместу) кідацца ў вочы, «адсылаць» чытачоў да прыказак, прымавак, устойлівых выразаў, назваў кніг альбо фільмаў, не мець штампаў і лішніх слоў, інтрыгаваць… І ўвогуле — выклікаць увагу да тэкстаў.

Каляжанка вось газету разгортвае, чытае (спачатку моўчкі, потым уголас):

— Выстава з пахмелкі.

Трасе галавой, не верачы вачам (беларускую мову яна ведае трохі горш, чым рускую) — чытае яшчэ раз:

— Ну яно ж «…з пахмелкі» ? Глянь!

Глядзім на заметку ўдзвюх: як высвятляецца, расповед там — пра выставу «…з пахам елкі».

…Загаловак як загаловак: не сказаць, каб бліскучы. Але ж аўтар, згадзіцеся, мэты дасягнуў — прыцягнуў увагу да тэксту.

І да выставы, магчыма, таксама.

ТАКОЙ БЯДЫ

Аўтобуса досыць доўга не было, а падышоў — людзей набілася, ды так — не павярнуцца! Хоць і хацелася б… Нават трэба было б, бо побач — яўна нездаровы дзяцюк: раз-пораз шмыгае заложаным носам, кашляе ў рукаво…

— Абы мікробы развозіць, — уголас абураецца нейкая жанчына. — Захварэлі — дык трэба дома сядзець!

— А на работу што — ты за мяне паедзеш? — ціха агрызаецца хворы.

Не мае, здавалася б, рацыі…

А зрэшты… Нехта з гумарыстаў пісаў:

Прастуда ды кашаль
На моцным марозе —
Ды гэта ж палова бяды.
Бяда, калі дойме панос
Пры склерозе:
Бяжыш… І не помніш куды…

ДЗЕЛЯ КАХАНАЙ

Сівізна ў бараду — чорт у рабрыну: Барысавіч закахаўся. І, здаецца, усур'ёз…

Не, з жонкай пакуль не развёўся, але, што называецца, болей з ёю не жыве: яна ў сваім пакоі кантуецца, ён — у сваім…

На выхадныя сын ім унучку падкінуў. Першае пытанне вечарам: «Бабуля, а чаму ты сцелеш сабе асобна? Ты з дзядулем болей не спіш?" — «Не, дзіцятка». — «А чаму?»

Прыстала — не адчапіцца. Вымусіла сказаць: «Ён мяне больш не любіць».

Як такое можа быць, дзіця не спыталася: доўга варочалася ў сваёй пасцелі, цяжанька ўздыхала, не спала. Відавочна, думала само, як гэта можна — не любіць бабулю, па-першае. А па-другое, некалі раней любіў (яна ж не сляпая — бачыла), а потым і раптам — не…

Раніцай да дзядулі звярнулася: «Ты, праўда, больш не любіш бабулю?.. Не, ты скажы — гэта праўда?»

…Дзеля той, каханай, Барысавіч, як здавалася, адолее ўсё: развод і расстанне з жонкай, высвятленне адносін з сынам, падзел маёмасці, пагарду радні…

Але вось гэтыя вачаняты…

ШЧАСЛІВАЯ

Гэтыя дзве сяброўкі не паводаль жывуць і адна ад адной сакрэтаў не маюць.

— От жа пакараў мяне Бог, — часцяком наракае маладзейшая. — Замужам толькі год пабыла — разышлася з п'яніцам… А фізіяномію яго ўсё роўна бачу — колькі разоў на дні!.. Не тое, што ты… Ты аж тройчы замуж выходзіла і ўсіх трох мужоў пахавала. Шчаслівая…

АБОЕ РАБОЕ?

…«Ну вось, ізноў абед прапусціў», — падумаў Сяргей, зірнуўшы на гадзіннік.

Пад лыжачкай па-здрадніцку смактала, але нават на перакус часу не заставалася: ён спазняўся ў Валожын. Да таго ж бензабак быў амаль пустым.

Давялося збочыць на запраўку. Заадно і ў крамку зазірнуў — узяў сабе кавы і нейкага пячэння. Сеў у машыну, крануўся з месца, уключыў дворнікі, бо накрапваў дождж, убачыў, што пад ім (прычым без шапкі, без парасона) галасуе жанчына.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пашкадаваў, што змокне, — спыніўся, падабраў; куды яе падвезці, спытаць не паспеў, бо ў яго зазваніў мабільны: калега-забудоўшчык прасіў параіць, дзе зараз выгадней (па якасці, па тэрмінах, па цэнах) замовіць дзверы.

Ведаючы, што коратка пра гэта не раскажаш, а есці хочацца і кава стыне, Сяргей, не спыняючы размовы па мабільным, сербануў глыточак, дастаў з кішэні цыгарэты (без іх жа і кава не кава!), спытаў у жанчыны дазволу закурыць…

І толькі цяпер заўважыў, што тая сядзіць, «забіўшыся» ў кут, што глядзіць адтуль (на яго, на дарогу…) поўнымі страху вачыма, што жэстамі нешта кажа.

Павярнуў галаву, каб засяродзіцца, пачуў ціхуткае: «Спыніце… Я выйду…».

Ён, мусіць, рэзка націснуў на тормаз, — машына стала. Пасажырка памалу, як не сваімі нагамі, выйшла.

«Ну-у… І варта было галасаваць, каб кіламетр праехаць! — са злосцю падумаў кіроўца, уключаючы перадачу, размаўляючы па тэлефоне, п'ючы каву і такі закурваючы. — Дурная нейкая…».

Тое ж самае, гледзячы яму ўслед, думала спадарожніца.

АЛЕ ЁСЦЬ!

Горад. Зіма, а свежай садавіны ды гародніны ў крамах — хоць завaліся.

Цэннік прывабіў: «Агурок калючы…». Падышлі, паглядзелі бліжэй — на яго, на кошт… Калючы і сапраўды…

Але ёсць!

ВУСНАМІ ДЗІЦЯЦІ

Наталка, дачка прыяцелькі, беларускія песні слухае, кніжкі чытае, родную мову вучыць, а таму часам выпытвае, хто такі *багатыр* і *прадажнік*, што такое *краска* і *кухаль*… А ўжо «Як перакласці з рускай?», дык гэта на кожным кроку цяпер.

Надоечы вось размова зайшла.

— А *наличные* — як па-нашаму будзе? — спытала Наталка.

— Гатоўка, — адказалі ёй, — альбо наяўныя грошы… Добрыя ж словы, праўда? Тыя, значыць, што ёсць — наяве.

…Дзяўчо, каб паказаць, што запомніла, тут жа ўзялося сказ будаваць, паведамляць прысутным, што зарплаты яе бацькам налічваюць на карткі, а вось пенсію дзядулю — даюць ***у***яўнымі.

Бабуля, злавіўшы вухам памылку, хацела была паправіць, ды потым чамусь перадумала.

ДЗЕ ДРОВЫ СЯКУЦЬ…

…Нічога дзіўнага ў тым не было: яны, маладыя, як птушкі вольныя, сустрэліся, пакахалі адно аднаго, пабраліся шлюбам — у іх нарадзілася дачка.

Зноў жа нічога дзіўнага — яму не падабалася жыць ва Украіне, на Маці засталася: ходзіць вось цяпер па дварэ, нешта робіць, з некім гаворыць, а вочы…

…Стагадовы дзед узгадваў пражытае. Расказваў, прынамсі, як у вёску да іх прыехалі немцы, як арыштавалі адну сям'ю, загналі ў гумно і запалілі… Як ацалеў у тым агні толькі бацька — жонка і дзеці згарэлі.

Немцы дазналіся, што ён выжыў, загадалі прыйсці. Той неяк прывалокся. Расказаў, як адвальваў з падмурка камень, як выбіраўся з агню…

Быў упэўнены, што яго даб'юць. Аднак немец сказаў: «Уставай ды ідзі. Ты і так мёртвы, цябе ўжо няма сярод жывых».

ДОМ ПРЫ ДАРОЗЕ

Будавалі яго не інакш, як на зайздрасць: вялікі, дыхтоўны, з прасторнай кухняй, з доўгай верандай… І пакояў шмат, але ж…

Печ адна — так званая руская і старая. Добра было б перарабіць і ў зале паставіць камін.

Дах над домам таксама адзін. Працякае — трэба зноўку латаць. А на добры толк — дык столькі новых матэрыялаў цяпер! Зняць бы тое ржавае жалеза, зрабіць страху з чарапіцы. І фасад абнавіць, бо фарба зусім аблупілася… Вокны людзі мяняюць…

Іван, як галоўны спадчыннік (старэйшы сын нябожчыцы-гаспадыні), галаву не для шапкі насіў і ніякіх работ не баяўся — ён падпружыўся б, як той казаў, і ўсё зрабіў… Калі б дом быў яго, уласны. А то ж не: тры сястры яшчэ — ні людскіх мужоў, ні грошай. Значыць, рамонтам ніводная з іх займацца не будзе… І ён таксама не дурны, каб гарбаціцца — на некага. Іншая справа, калі адмовяцца сёстры ад сваіх доляў спадчыны, адпішуць — не чорту ж лысаму, не чужаку — роднаму брату.

Аргументы яго, вядома ж, выглядалі важкімі, прапанова — цалкам зразумелай і лагічнай, але прыняць яе сёстры не маглі: нешта замінала. Можа, якраз тое, што ў іх і сапраўды не было ні тых клятых грошай, ні добрых гаспадароў… Але ж былі дзеці! Усе яны раслі ў бабулі з дзедам, жылі — хто больш, хто трохі менш — у вялікім вясковым доме: бавілі ўсе канікулы, збіралі ягады ды грыбы, лавілі рыбу, саджалі бульбу (што для сем'яў было істотным падмацункам); яны ж, стрыечнікі, любілі з'язджацца на так званую гістарычную радзіму, мелі права на нейкі прыстанак… У выпадку ж адмовы ад спадчыны з домам прыйшлося б развітацца, збірацца там хіба раз у год — на Радуніцу…

Якраз гэтага, відаць, сям'я брата і хацела, бо адносіны сапсавала з усімі. «Галоўны спадчыннік», у прыватнасці, псіхаваў, пагражаў сваім сёстрам судом, гойсаў да нейкіх юрыстаў, пакуль…

Пакуль, ваюючы за дом, не знайшоў… дамавіну — не загінуў (сёстры да скону сабе не даруюць!) у страшнай аварыі.

Было гэта гадоў сем таму — даўно: у жыцці сясцёр вельмі шмат што змянілася…

І не змянілася, бо дом стаіць — акуратны, дагледжаны. З тых стрыечнікаў асобныя ўжо падраслі, пайшлі на свой хлеб, двое нават на грошы ўзбіліся. І накрылі новым шыферам дах. І пафарбавалі фасад. І памянялі горшыя вокны…

А печы не разваліліся, па-ранейшаму служаць. Таму госці — нават зімой — у доме збіраюцца: там заўсёды ёсць чым заняцца, там добра і цёпла, там…

Там хапіла б месца ўсім.

Валянціна ДОЎНАР

■

ІДЗІ І ЖЫВІ

У Таццяны сын загінуў — раптоўна, недарэчна…

■ Падзея

«Чорнае золата»

Спецыялісты «Беларуснафты» адкрылі ў Венесуэле новае радовішча

У прэс-службе вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» паведамілі, што на радовішчы Блока II Лагунільяс у выніку засваення адной са свідравін атрыманы фантанны прыток бязводнай нафты дэбітам 1400 барэляў у суткі. Для параўнання: сярэдняя сутачная здабыча з адной свідравіны на возеры Маракайба не перавышае 75 барэляў. Работа на свідравіне пачалася сёлета ў канцы красавіка, і асноўным мэтавым аб'ектам было засваенне ўжо вядомай залежы ў гарызонце В5. Паралельна беларускія спецыялісты СП «Петралера БелаВенесалана» абгрунтавалі неабходнасць большага паглыблення свідравіны разведачным ствалом: даныя інтэрпрэтацыі сейсмічнага матэрыялу слаёў, што ляжаць ніжэй, даказвалі перспектыўнасць пошукаў. Пры свідраванні ўжо за межамі контураў афіцыйных запасаў былі знойдзены два нафтаносныя пласты — С4 і С7. Тым самым адкрыліся новыя залежы на радовішчы Блок II Лагунільяс.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■

ЗАПРАШАЕМ

РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»

Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

ООО «Форсолвер» (организатор аукциона)
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:

ДВУХЭТАЖНОГО КИРПИЧНОГО ЗДАНИЯ УЧЕБНОГО КОРПУСА

(здания специализированного для образования и воспитания)
с инвентарным номером 350/С-156928,
общей площадью – 783,6 м.кв.,
расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Волгоградская, 2а,
на земельном участке, площадью 0,1145 га,
предоставленном на праве аренды.
Переход права на земельный участок осуществляется
в соответствии с действующим законодательством.

Начальная цена – 1 880 640 000 бел. рублей с НДС.
Шаг аукциона – 5% начальной стоимости объекта.
Задаток – 95 000 000 бел. рублей с НДС.

Задаток перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет 3012403517013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, УНП 491058984, получатель платежа ООО «Форсолвер», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 19.12.2014 г.

Порядок проведения открытого аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в регламенте его проведения, размещенного на сайте **standard.by.**

Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие на покупку объекта) обязан: в течение 3 (трех) рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере двух процентов от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объекта; в течение 5 (пяти) рабочих дней после заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объекта, сформированную в установленном порядке.

Аукцион состоится **23 января 2015 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 22 января 2015 г. до 16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 0232 22 48 82,
+ 375 29 685 49 86.
E-mail: 6854986@standard.by.

Standard.by®

Ликвидационная комиссия проводит повторные открытые торги в форме аукциона по продаже имущества торгового унитарного предприятия «Любаньстройматериалы» открытого акционерного общества «Белорусский цементный завод»

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота за единицу (без НДС), бел. руб.	Шаг торгов, бел. руб.	Задаток для участия в торгах, бел. руб.
1	Полуприцеп бортовой МАЗ-93866 (номер рамы 0002140, рег. номер 5144 АА-5) 1992 года выпуска	20 025 000	1 001 250	2 002 500
2	Легковой специальный седан Фольксваген Пассат (номер кузова WVWZZZ3BZ2E372903, рег. номер 1955 ЕР-5) 2002 года выпуска	64 856 000	3 242 800	6 485 600

Продавец	ТУП «Любаньстройматериалы» ОАО «Белорусский цементный завод»
Организатор торгов	Ликвидационная комиссия
Место проведения торгов	Могилевская обл., г. Костюковичи (административный корпус ОАО «Белорусский цементный завод», 4 этаж, каб. 406)
Время проведения торгов	29.12.2014 г. в 12.00
Срок подачи заявок	До 29.12.2014 включительно
Порядок подачи заявок	По почте: 213640, Могилевская обл., г. Костюковичи, ОАО «Белорусский цементный завод»
Срок оплаты задатка	До 29.12.2014 включительно
Реквизиты для оплаты задатка	ТУП Любаньстройматериалы» ОАО «Белорусский цементный завод» р/с 3012236913013 в ЦБУ 613 г. Любань, филиала № 633 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 969, УНН 690033121

Условия торгов

- Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену;
- Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов;
- Победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;
- Победитель торгов оплачивает при заключении договора купли-продажи цену с учетом НДС за вычетом суммы внесенного задатка (т.е. наиболее высокая цена, предложенная участником торгов, при заключении договора купли-продажи увеличивается на сумму НДС);
- В случае отказа или уклонения победителя торгов от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, а также в иных случаях, предусмотренных законодательством, внесенный им задаток возврату не подлежит);
- В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Получить информацию о порядке проведения торгов, а также ознакомиться с документацией и объектами торгов можно, обратившись к организатору торгов по телефону: (8-029) 540-30-34.

УНП 600013173

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что внеочередное собрание акционеров состоится 29 декабря 2014 года по адресу: г. Минск, пер. Физкультурный, 34 (УП «ОМЗ «Агротехконмаш»).
Начало собрания **в 15.00.** Регистрация акционеров **с 14.30.**
При себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Распределение прибыли, остающейся в распоряжении Общества, за 2013 год и утверждение дивидендов.
2. Утверждение положения о порядке продажи жилых домов, состоящих на балансе унитарных предприятий Общества.

Тел. 224-19-17 *Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»*

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже жилищных облигаций третьего выпуска

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» (далее – СООО «ВильнюсСтрой»)

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:
на белорусском языке:
полное: Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВільнюсБуд»;
сокращенное: СТАА «ВільнюсБуд»;
на русском языке:
полное: Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» (далее – Эмитент);
сокращенное: СООО «ВильнюсСтрой».

2. Место нахождения Эмитента, телефон, факс, адрес электронной почты (e-mail): Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1-ый этаж, каб. 60, тел./факс: (8-017) 222 79 80, e-mail: Vilnusstroy@gmail.com.

3. Основные виды деятельности Эмитента.
Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности ОКРБ 005-2006»).

4. Номера расчетного счета Эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи жилищных облигаций, наименование обслуживающего банка.
Денежные средства при проведении открытой продажи жилищных Облигаций третьего выпуска Эмитента (далее по тексту – Облигации) будут поступать на счет Эмитента:
получатель: СООО «ВильнюсСтрой»
УНП получателя: 191434087
расчетный счет: 3012000070758
наименование банка: ОАО «Белгазпромбанк», код 742
адрес банка: г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2
назначение платежа: оплата жилищных облигаций СООО «ВильнюсСтрой» третьего выпуска согласно договору от _____._____.201__ г. № _____.

5. Наименование периодического печатного издания, определенного Эмитентом, для раскрытия информации и сроки таких публикаций.
Бухгалтерская отчетность Эмитента по итогам работы за 2014 год будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного года.
Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Эмитента подлежит публикации в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» не позднее 2 (двух) месяцев с момента принятия соответствующего решения.
Информация о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) подлежит публикации в средствах массовой информации в течение 5 (пяти) дней с момента получения управляющим соответствующего судебного постановления.
Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (семи) дней с даты осуществления Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь регистрации соответствующих изменений в Проспект эмиссии.

6. Сведения о депозитарии, обслуживающем Эмитента.
Депозитарием Эмитента является Закрытое акционерное общество «Генеральная система инвестиций», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 117А, пом. 12, комн.4, зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 24 ноября 2000 г. регистрационный номер 100784324, действующее на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 0220/5200-124-1128 Министерства финансов Республики Беларусь от 29 июля 2002 года (срок действия лицензии – до 29 июля 2022 года).

7. Размер уставного фонда Эмитента.
Уставный фонд Эмитента сформирован полностью в размере, предусмотренном Уставом: 35 400 (Тридцать пять тысяч четыреста) долларов США.

8. Дата, номер государственной регистрации Эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего.
Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 20.10.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191434087.

9. Дата принятия решения о выпуске Облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о третьем выпуске жилищных облигаций принято 01.12.2014 Общим собранием участников Эмитента (протокол от 01.12.2014 № б/н).

10. Форма выпуска Облигаций, объем эмиссии, количество Облигаций, серия, номера.

Форма выпуска и вид Облигаций	Жилищные, бездокументарные, именные, конвертируемые
Количество Облигаций	2 650 (две тысячи шестьсот пятьдесят) штук
Объём эмиссии Облигаций	16 165 000 000 (Шестнадцать миллиардов сто шестьдесят пять миллионов) белорусских рублей
Серия Облигаций	ВСТ-3
Номера Облигаций	000001-002650

11. Номинальная стоимость Облигации.
Номинальная стоимость одной Облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (одному) метру квадратному общей площади жилого помещения по СНБ в строящемся в составе объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (II-я очередь – жилой дом № 8 по генплану и ПНС № 12 по генплану) жилом доме № 8 по генплану (далее – жилой дом № 8 по генплану).
Общий эквивалент номинальной стоимости Облигаций составляет 2650 (две тысячи шестьсот пятьдесят) квадратных метров.
Эквивалент номинальной стоимости Облигаций не подлежит изменению в течение срока обращения Облигаций настоящего выпуска.

12. Цель выпуска Облигаций и направления использования средств, полученных от их размещения.
Целью выпуска Облигаций является привлечение денежных средств физических и (или) юридических лиц для осуществления строительства объекта «Группа жилых домов типовых потребительских качеств в границах улиц Тимирязева, Панфилова, Москвина, Репина в г. Минске» (II-я очередь – жилой дом № 8 по генплану и ПНС № 12 по генплану) (далее – Объект жилищного строительства), в том числе для обеспечения хозяйственной деятельности Эмитента, связанной с выполнением им функций заказчика (застройщика).
Эмитент использует средства, полученные от размещения Облигаций, в соответствии с целями выпуска.

13. Сведения об обеспечении выпуска Облигаций.
Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечивается поручительством Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ» (далее по тексту – Поручитель) согласно договору о предоставлении поручительства от 01.12.2014 № 01/12/П, заключенному между Эмитентом и Поручителем на общую сумму 16 165 000 000 (Шестнадцать миллиардов сто шестьдесят пять миллионов) белорусских рублей.
Место нахождения Поручителя: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1-ый этаж, каб. 49; УНП 101186296.
Поручитель зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 17.07.2001 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101186296.

14. Период размещения Облигаций.
Датой начала размещения Облигаций является 20 декабря 2014 года.
Датой окончания размещения Облигаций является 15 ноября 2016 года.

15. Место, время и порядок размещения Облигаций.
15.1. Размещение Облигаций осуществляется Эмитентом самостоятельно, начиная с даты начала размещения, ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1-ый этаж, каб. 60.
15.2. Размещение Облигаций осуществляется Эмитентом путем:
- конвертации (обмена) жилищных облигаций Эмитента второго выпуска, зарегистрированных в Государственном реестре ценных бумаг 15 сентября 2014 г., регистрационный номер 5-200-02-2275, на жилищные облигации Эмитента третьего выпуска;
- открытой продажи физическим и юридическим лицам – резидентам и нерезидентам Республики Беларусь на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь Облигаций, которые не были размещены при конвертации второго выпуска.
15.3. Конвертация жилищных облигаций второго выпуска осуществляется Эмитентом:
в отношении лиц, указанных в реестре владельцев жилищных облигаций второго выпуска, сформированного по состоянию на день, следующий за днем регистрации в Государственном реестре ценных бумаг жилищных облигаций третьего выпуска;
на основании письменного согласия владельцев жилищных облигаций второго выпуска на конвертацию жилищных облигаций третьего выпуска, заключивших договор (соглашение) в простой письменной форме, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам облигаций второго выпуска;
в следующем соотношении: одна жилищная облигация второго выпуска номинальной стоимостью 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей конвертируется (обменивается) на одну жилищную облигацию третьего выпуска номинальной стоимостью 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей;
на основании договора конвертации, заключенного с владельцами жилищных облигаций второго выпуска.
При осуществлении конвертации жилищных облигаций второго выпуска их владелец не позднее рабочего дня, следующего за днем зачисления на его счет «депо» Облигаций, размещаемых путем конвертации жилищных облигаций второго выпуска, обязан осуществить перевод жилищных облигаций второго выпуска (погашаемых жилищных облигаций) на счет «депо» Эмитента.
15.4. Открытая продажа инвесторам Облигаций осуществляется путем заключения договора с Эмитентом на приобретение Облигаций по установленной Эмитентом форме (далее по тексту – договор).
До момента приобретения (как в процессе размещения Облигаций, так и в процессе их обращения) Облигаций инвесторы должны заключить с Эмитентом договор в простой письменной форме, установленной Эмитентом, предусматривающий обязательства Эмитента по строительству жилых помещений владельцам Облигаций.
Открытая продажа Облигаций осуществляется по цене, определяемой Эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи Облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

16. Срок обращения Облигаций устанавливается с 20 декабря 2014 года по 30 ноября 2016 года включительно и составляет 711 календарных дней.

17. Дата начала погашения Облигаций: 30 ноября 2016 года.

18. Доход по Облигациям не начисляется и не выплачивается.

19. Дата и номер государственной регистрации Облигаций.
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 18 декабря 2014 г.
Регистрационный номер: № 5-200-02-2425.

20. Место, время и способ ознакомления с Проспектом эмиссии Облигаций.
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии Облигаций можно ознакомиться в течение срока размещения Облигаций: ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1-ый этаж, каб. 60. Ознакамливающееся лицо имеет право читать и делать выписки из предоставляемых в соответствии с настоящим пунктом документов.

Директор
СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич

Главный бухгалтер
СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская

■ Неасабісты суб'ектыў

...А З ПАПЕРКАЙ — ЧАЛАВЕК

ПРАЎДА, ПРЫ ЎМОВЕ, КАЛІ ДАКЛАДНА ВЕДАЕШ, ШТО Ў ТОЙ ПАПЕРЦЫ НАПІСАНА

ВЫПАДАК, пра які сёння хачу расказаць, нягледзячы на яго «вузкую спецыфіку» (калі быць больш дакладнай — паляўнічую), можна назваць калі не тыповым, то паказальным. Пачуты ён з першых вуснаў, ад самага непасрэднага ўдзельніка гэтай амаль дэтэктыўнай гісторыі. Цана пытання атрымалася — тры мільёны рублёў. Зрэшты, аб усім па парадку.

Дык вось, прыяцель мой са сваім сябрам вырашылі ў нядзелю пасоваца са стрэльбай па лесе. Абодва — заўзятыя паляўнічыя з вялікім стажам, прычым паляўнічыя сумленныя: у іх заўсёды і пуцёўкі ў парадку, і дакументы на зброю, і сабакі, як належыць, пародзістыя, з пашпартамі. З-за гэтага самага пародзістага сабакі — эстонскага ганчака — яны ў гісторыю і трапілі. Малады шчанюк, налётаўшыся і набрахаўшыся, не знайшоў нічога лепшага, як падацца дадому. Гаспадыня яго ціхенька навязала і пачала чакаць мужа, які павінен быў прыйсці ўслед за сабакам. А муж з сябрам, замест таго, каб ісці дахаты, збіліся з ног, шукаючы ўцекача. І свісталі, і крычалі, і ў рулю стрэльбы трубілі. Карацей, прыцягнулі пільную ўвагу супрацоўнікаў інспекцыі па ахове жывёльнага і раслінага свету, якія якраз шукалі ў наваколлі браканьераў: мясцовыя пазванілі, што тыя, прыехаўшы на машыне з мінскімі нумарамі, нібыта забілі лася. Нашым героям баяцца не было чаго, таму ад інспектараў яны ўцякаць не сталі, наадварот, пачакалі, пакуль тыя падыдуць, павіталіся, прад'явілі ўсе свае паляўнічыя дакументы…

ВОСЬ тут «няўвязачка» і выйшла. Высветлілася, што сярод паперак няма адной квітанцыі на аплату. Аплата гэта была ўведзена толькі з лета — калі ўступілі ў сілу змены ў правілы паляванне. Нашы гора-паляўнічыя пра яе не ведалі («ну не дайшлі рукі ўважліва пачытаць!»), і не яны адны. У таго, хто выпісваў ім пуцёўкі, таксама, пэўна, «рукі не дайшлі», бо без гэтай самай квітанцыі дазвол на паляванне даваць нельга было. Зрэшты, інспектараў гэтыя дэталі асабліва не хвалявалі. Парушэнне было, як той казаў, у наяўнасці: паспачуваўшы па-чалавечы вясковым мужыкам, яны ўсё ж склалі пратакол і забралі стрэльбы. Параілі толькі: справа будзе перададзена ў суд, дык вы падайце на тых, хто няправільна пуцёўкі выпісваў, сустрэчны іск.

Суд нядаўна адбыўся. «Упаялі» хлопцам па тры мільёны штрафу — дваццаць базавых велічынь. Сустрэчны іск, зразумела, яны падаваць не сталі: заўтра ім па тыя ж пуцёўкі туды ж ісці. Стрэльбы ім хутка вернуць, але на паляванне яны наўрад ці ў гэты сезон збяруцца: не задаўся ён з самага пачатку, нават хваста ад зайца дамоў не прынеслі, а па зарплаце, лічы, на вецер выкінулі.

ЯКАЯ мараль? Можна, безумоўна, доўга і нудна разважаць пра чыноўнікаў, якія самі не ведаюць, што пішуць, пра нягнуткасці прававых актаў, якія і за канкрэтную шкоду, і за недахоп нейкай паперкі прадугледжваюць аднолькавае спагнанне… Але найперш, мне здаецца, трэба гаварыць пра наша нежаданне самім, выбачайце за казённыя словы, павышаць сваю прававую адукацыю і пра нашу празмерную даверлівасць. Мы нярэдка настолькі перакананы ў тым, што ўсё ў дакументе, які падпісваем, складзена правільна, што нават не даём сабе клопату элементарна пачытаць тое, што падпісваем. А аб тым, каб яшчэ і дэталёва пацікавіцца інфармацыяй, якая ў дакументе закладваецца, размова ў большасці выпадкаў увогуле не вядзецца. Якія гэта дакументы — у нашым кантэксце няважна: ад пуцёўкі на паляванне да дагавора аб банкаўскім крэдыце на вялізную суму ці аб куплі кватэры або аўтамабіля. Пасля аказваецца, што пуцёўка выпісана няправільна, працэнты за карыстанне крэдытам — непад'ёмныя, машына значыцца скрадзенай. Кашалёк пусцее, нервы псуюцца, а мы здзіўлена лыпаем вачыма і абураемся: як жа так, гэта ж рыхтавала адказная асоба, якая за гэта грошы атрымлівае. Чамусьці не задумваемся пра тое, што гэта самая адказная асоба можа аказацца проста не вельмі добрым і дасведчаным работнікам, або, у горшым выпадку, — махляром.

ДАРЭЧЫ, пра махляроў. Літаральна пазаўчора сяброўка вярнулася са сваёй паездкі па аўто ў Маскву. Дагэтуль не можа ачомацца і паверыць, што ўсё гэта здарылася менавіта з ёй і што ўсё так добра для яе скончылася. Яны з мужам вырашылі памяняць машыну. А паколькі расійскі рубель увесь час падае, а цэны ў доларавым эквіваленце ў тамтэйшых аўтасалонах пакуль ранейшыя, у той жа Маскве цяпер вельмі выгадна можна купіць нават новае аўто. Прынамсі, так думалі мае знаёмыя, калі шукалі той салон у інтэрнэце, наладжвалі перапіску з яго прадстаўнікамі, атрымалі пацвярджэнне цаны і наяўнасці і нават тэлефонны званок пра тое, што машына за імі забраніравана. З радасцю падаліся ў Белакаменную, прыехалі ў той шыкоўны салон у цэнтры горада. Афармілі паперы, заплацілі грошы, не бачачы «тавару», які нібыта стаяў дзесь на стаянцы… Пайшлі забіраць пакупку, і тут высветлілася, што яе проста няма ў наяўнасці. Кінуліся вяртаць грошы, а ім у адказ: вярнуць не можам, яны ўжо адвезены ў банк. Едзьце, дарагія браты-беларусы, у свой Мінск, пакіньце нам нумар рахунку, мы на яго вам вашы кроўныя як-небудзь да новага года пералічым. Скардзіцца можаце куды заўгодна, нам ніхто не страшны. А будзеце тут абурацца — мы вас пад белыя рукі выведзем і будзеце дзякаваць Богу, што жывыя-здаровыя выйшлі.

Карацей, сяброўку выратавала тое, што яна журналіст, ды яшчэ сярод маскоўскіх знаёмых у яе капітан ФСБ аказаўся. Пра што яна таварышам з аўтасалона і паспяшалася паведаміць. Грошы — 8 тысяч долараў — ёй вярнулі. Прычым зрабілі гэта ў асобным пакоі, ціхенька, і вывелі праз чорны ход. Каб не бачылі астатнія «лахі», што сядзелі ў аўтасалоне, чакаючы «афармлення». Большасць з іх, дарэчы, была з Беларусі. Падазраю, што ім, уражаным шыкоўнасцю аўтасалона і ветлівасцю персаналу, нават у галаву не прыйшло прачытаць уважліва дагавор, прачытаць у тым жа інтэрнэце водгукі пра гэты салон, ды, урэшце, перад тым, як выкладваць грошы, патрабаваць калі не прыгнаць машыну, дык даць у рукі ключы ад яе.

ШТО робяць гэтыя людзі цяпер? Пэўна, чакаюць новага года, да якога, як абяцалі ў салоне, нехта пералічыць пакінутыя там грошы. Хіба што гэта будзе Дзед Мароз…

Алена ЛЯЎКОВІЧ

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.25	16.48	7.23
Віцебск —	9.22	16.30	7.08
Магілёў —	9.15	16.38	7.23
Гомель —	9.03	16.43	7.40
Гродна —	9.39	17.05	7.26
Брэст —	9.31	17.14	7.43

Месяц

Маладзік 22 снежня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *МІКАЛАЯ ЦУДАТВОРЦА.*
К. *Дар'і, Элеаноры, Рыгора, Урбана.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Калі купля аўтамабіля вас зусім не радуе, значыць, вы купілі яго жонцы, а крэдыт аформлены на вас.

— Доктар, аперацыя прайшла паспяхова?

— Так, віншую вас, цяпер вы жанчына! І ў душы, і вонкава!

— Але мне ж павінны былі выразаць апендыкс!

— Вечна вам, бабам, не дагодзіш!

Сёння я перастаў быць вядучым электрыкам у сям'і, таму што паказаў жонцы, як уключаць аўтамат пасля таго, як у люстры перагарэла лямпачка...

— Алё, таксі? Я ўжо паўгадзіны чакаю машыну апельсінавага колеру!

— Дзяўчына!

Вас ужо паўгадзіны чакае «Опель» сіняга колеру!

Хітрыя менеджары вырашылі правесці вяселле майстра каратэ з чэмпіёнкай па таквандо і чэмпіянат па баях без правілаў як адно мерапрыемства. І не прагадалі!

З тлумачальнай міністра сельскай гаспадаркі:

«За лета адна мыш-палёўка з'ядае да тоны збожжа...»

НАРОДЖАНЫЯ 19 снежня

Гэтых людзей адрознівае развітая здольнасць выклікаць эмацыянальныя рэакцыі ў навакольных. У любых сітуацыях яны застаюцца самімі сабой. Здольнасць пераадольваць цяжкасці выклікае шчырае захапленне ў тых, хто побач з людзьмі гэтага дня. Яны схільныя да захаплення, не вельмі дысцыплінаваныя натуры, здольныя наладзіць праверку цярплівасці сваіх сяброў і родных. Па жыцці людзі гэтага дня крочаць сваім, ні на каго не падобным, шляхам. Яны адчуваюць вялікую патрэбу ў простых зносінах з навакольнымі, а іх пачуццё гумару мае іранічны характар.

Даты Падзеі Людзі

19 СНЕЖНЯ

1597 год — заснаваны каталіцкі манаскі ордэн піяраў. Мэта ордэна — хрысціянскае выхаванне і навучанне юнацтва. У 1641 годзе кароль Уладзіслаў IV папрасіў заснавальніка ордэна Іосіфа Каласансу даслаць піяраў у Рэч Паспалітую, каб пазбавіцца ад манаполіі езуітаў у галіне адукацыі. На тэрыторыі Беларусі манастыры і рэзідэнцыі піяраў пры падтрымцы магнатаў і шляхты з'явіліся ў Шчучыне, Воранаве і Геранёнах, Зэльве, Лужках, Віцебску, Драгічыне-Надбужскім. Пры ўсіх кляштарах існавалі калегіумы.

1788 год — руская армія захапіла турэцкую крэпасць Ачакаў. У 1787 годзе Турцыя, імкнучыся падпарадкаваць сабе Крымскае ханства і Грузію, аб'явіла Расійскай імперыі ўльтыматум. Пачалася руска-турэцкая вайна 1787-1792 гадоў. Галоўныя падзеі гэтай кампаніі разгарнуліся вакол крэпасці Ачакаў, якую ў ліпені 1788 года асадзіла 80-тысячная армія Пацёмкіна. Суворaў прапанаваў узяць Ачакаў штурмам. Але Пацёмкін аддаў перавагу плану «фармальнай аблогі». Ён дзейнічаў пасіўна, і аблога зацягнулася на 5 месяцаў. 19 снежня войскі пайшлі на штурм Ачакава. У той жа дзень крэпасць была захоплена. Трафеямі рускіх сталі 310 гармат і 180 варожых сцягоў. Было захоплена ў палон 4,5 тысячы турак. Паколькі Ачакаў быў узяты ў дзень святога Мікалая, то ў наступным годзе заснаваны Пацёмкіным новы горад быў названы ў гонар гэтага святога — Нікалаеў.

1992 год — ЮНЕСКА ўключыла нацыянальны парк «Белавежская пушча» ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны чалавецтва. Гэтая мясцовасць упершыню згадваецца ў «Гісторыі» старажытнагрэчаскага гісторыка Герадота (V ст. да н. э.), які называе таксама племя неўраў, што жылі на берагах рэк Нараў і Лясная. Згадкі пра плямёны, якія засялялі белавежскі лясны масіў, ёсць таксама ў працах рымскага пісьменніка і вучонага Плінія Старэйшага і гісторыка Тацыта (I-II стст.). У 983 годзе ў Іпацьеўскім летапісе згадваюцца яцвягі, якія засялялі тэрыторыю Белавежскай пушчы — найстарэйшага ляснога запаведніка Еўропы. Назва лесу дала 30-метровая Белая вежа, збудаваная па загадзе Уладзіміра Валынскага ў 1276 годзе для абароны заходніх межаў свайго княства.

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, публіцыст:

«Прайграць не прыніжэнне. Прыніжэнне — кпіць з таго, хто мужна прайграў».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ ТЭЛЕМАЎ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.010. Індэкс 63850. Зак. № 5130.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 снежня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12